Mater Lithvaniae, ora pro nobis!

ЛІТВА

глос монархісты

№ XIX (19)

МЕСЯЦ СТУДЗЕНЬ-ЛІПЕНЬ AD MMV (2005)

ҐАЗЭТА ЗАСНАВАНА AD MCMVIII (1908),
АДНОЎЛЕНА AD MCMVC (1995)

Гісторыя

Палітычны народ Вялікага Княства Літоўскага ў XVI стагодзьдзі: паняцьце Айчыны
Як нашыя продкі разумелі паняцьце Айчыны? Дзе для іх заканчвалася Літва? Пытаньні ня меней важныя і сёньня – і мы маем на іх адказ! **(стар. 2)**

Ідэі

Да пытаньня аб спробах рэстаўрацыі ВКЛ у канцы XIX-XX стагодзьдзях
Хто і як хацеў аднавіць ВКЛ на пачатку XX стагодзьдзя? Якімі межамі валодала б гэтая дзяржава і які пануючы лад быў бы ў ёй? **(стар. 5)**

Гістарычная філязофія

Польшча адносна Літвы
Урывак з кнігі арыгінальнага польскага філёзафа і гісторыка Фэлікса Канэчнага "Польскі Лёгас і Этас" **(стар. 8)**

Рэвалюцыя і асоба

Контаррэвалюцыя ў Чылі
Стрымаць камуністычную навалу мог толькі гэнэрал і толькі Яго Міласьць Аўгуст Ёзэф Рамон Пінаchэт Угартэ – прыклад пабожнага каталіка і вернага сына сваёй Айчыны **(стар. 10)**

БЭНЭДЫКТ XVI

У ГЭТЫМ 2005 Г. АДБЫЛАСЯ НАДЗВЫЧАЙ ВАЖНАЯ РЭЧ для ўсяго каталіцкага сьвету. На сталіцу сьв. Апостала Пятра ўзыйшоў Ёзэф кардынал Ратцынгэр, які абраў імя Бэнэдыкта XVI. Выбары новага Папы выдатным чынам, на нашую думку ахарактэрызавалі дзейнасьць Папы мінулага – Яна Паўла II. Справа ў тым, што Ян Павал II, пад час свайго доўгага пантыфікату, стабілізаваў Касьцёл, вярнуў Яму яснае іерархічнае аблічча разам з чым скончыўся пэрыяд постсаборнага "разброду і шатаньняў". Выбар новага Папы – Бэнэдыкта XVI пазытыўна характарызуе выбар кардыналаў, ажыцьцёўлены Янам Паўлам II. Так, Ян Павел II ня быў свабодны ад шматлікіх хібаў, што былі ў Касьцеле і грамадзтве ў сярэдзіне XX ст., але Бог не дапусьціў Пантыфіку трапіць у гарэзію, ані разбурыць фундамэнтаў Касьцёла. Гэта яшчэ раз сьведчыць пра тое, што Пятровы Човен кіруецца не людзьмі, але Госпадам Богам!

Habemus Papam! Бэнэдыкт XVI годны наступнік на Троне Пятровым. Яго Сьвятасьць Ян Павал II Вялікі падрыхтаваў гэты выбар.

І сёньня ў нас ёсьць Папа, які яшчэ перад выбарам, як Ёзэф кардынал Ратцынгэр сказаў: "Як шмат вятроў-вучэньняў мы перажылі за апошнія дзесяцігодзьдзі! Як шмат ідэалягічных плыняў! Як шмат модаў на думкі... Дрэйф думкі шмат каго з хрысьціянаў быў нярэдка спрычынены гэтымі хвалямі, кідаючы іх з аднаго экстрыму ў другі. Ад марксізму да лібэралізму; ад калектывізму да радыкальнага індывідуалізму; ад атэізму да **сумніўнай** рэлігійнай містыкі; ад агнастыцызму да сінкрэтызму і г.д... Сьвядомасьць яснай хрысьціянскай веры часта называецца фундамэнталізмам. Пры гэтым зьяўляецца рэлятывізм, што азначае "даць панесьці сябе кожнаму ветру вучэньня", – як адзіна магчымыя паводзіны адпаведныя часу. Гэта стварае дыктатуру рэлятывізму, якая не прызнае нічога вызначанага і апошняю мерай прызнае Я і жаданьні гэтага Я... Мы ж маем іншую меру: Сына Божага, сапраўднага чалавека... Гэта дае нам крытэрый – як адрозьніваць праўду і фальш, падман і рэчаіснасьць. Гэтаю верай мы павінныя даць узбагаціцца, да гэтай веры мы павінныя весьці Хрыстовы карабель."* Як даўно мы гэтага ня чулі.

Верны

* цытата паводле "Die programmatische Predigt vor dem Konklave", IK-Nachrichten 6 Jahrgang, Nr.5 Mai 2005 (перакл. – АСК)

ПСТОРЫЯ

ПАЛІТЫЧНЫ НАРОД ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XVI СТАГОДЗЬДЗІ: РАЗУМЕНЬНЕ АЙЧЫНЫ

ЛІТОЎСКІ ФІЛЁЗАФ АНТАНАС МАЦЕЙНА пісаў у першай палове XX стагодзьдзя: ***Айчына гэта створанае гісторыяй мейсца*** *прабываньня народу. Ахоплівае яно прастору таксама, як і час, у якім гэтая прастора зьмяняецца і якім паўстаюць духоўныя творы, якія зьяўляюцца яе зьместам. Таму для разуменьня Айчыны адной толькі гэаграфіі не стае. Яна павінна быць поруч з гісторыяй. Можа нават болей у гісторыі чым гэаграфіі.*

Сучасны філёзаф-гэрмэнэўтык Ханс-Гэорг Гадамэр разуменьне Айчыны зьвязвае з мовай. Ён піша: *Але так сапраўды Айчына зьяўляецца Айчынай мовы. Родная мова для кожнага захоўвае рысы нечага народнага; гэта адносіцца таксама да паліглёта, нават калі той, толькі спарадычна сустракаючыся з людзьмі са сваёй краіны ўжывае родную мову.*

Такое разуменьне Айчыны сёньня зьяўляецца блізкім для шмат каго з нас. Бо цяжка не згадзіцца з Гадамэрам, калі той кажа:

Калі вяртаемся з чужой краіны да дому, раптам сустрэча з роднай мовай нас зачароўвае; ўвесь ахінаючы нас сьвет зьяўляецца нібыта перапоўнены гучаньнем роднае мовы.

Аднак гісторыкаў антычнае пары, сярэднявечча і раньніх дзеяў сучаснасьці гэтыя разважаньні прымушаюць задаць пытаньне: як далёка ў мінулае можна перанесьці такое разуменьне – атаясамленьне Айчыны з моваю.

Для тых, хто аналізуе гісторыю Вялікага Княства Літоўскага прадмет сувязі Айчыны і мовы мае асаблівае значэньне. Без зразуменьня адносінаў тагачаснай шляхты да мовы не зразумеем гэтай супольнасьці; а яшчэ больш – зьявіцца небясьпека стварэньня вычваранага альбо несапраўднага вобразу шляхты былой літоўскай дзяржавы і яе адносінаў да Літвы, як да Айчыны.

Да чаго вядзе спроба атаясамленьня Вялікага Княства Літоўскага з актуальнай літоўскай дзяржаваю, і шляхты тых часоў з сёньняшнім літоўскім народам, а таксама спроба ацэнкі паводле этнічных і моўных крытэрыяў, можна пераканацца чытаючы разважаньні літоўскага філёзафа Арвідаса Шлёгэрыса:

Сучасная Літва паўстала інакш чым, скажам Рымская Рэспубліка, сярэднявечная Францыя, сучасная Нямеччына ці народы і дзяржавы Скандынавіі. На чым грунтуецца асаблівасьць гэтага ўтварэньня? Сучасная Літва паўстала з мовы і выключна з мовы, чаго нельга сказаць пра ўзгаданыя вялікія гістарычныя народы. Зьяўленьне Літвы было ненатуральнае ў пэўным сэнсе штучнае; яна паўстала як вынік увядзеньня ў жыцьцё моўнага праекту (можна нават сказаць ідэалягічнага ці ўтапічнага), як вынік сьвядомай дзейнасьці, сьвядомай волі і сьвядомай рашучасьці. Нармальныя дзяржавы паўстаюць, разьвіваюцца і квітнеюць зусім інакш чымсьці сучасная Літва. А што з сучаснай Літвою? Кім былі яе айцы-заснавальнікі? Як яна паўстала?

Адказваючы на гэтае пытаньне філёзаф падкрэсьлівае што:

Паміж Літвою Вялікіх Князёў і сёньняшняй Літвою няма ні непасрэднага, ні ўскоснага пераходу ані сувязі. Шуканьне каранёў сучаснай Літвы ў эпоху Гедыміна ці Вітаўта будзе тым жа, як шуканьне ў праху нябожчыка жывога б'ючага сэрца, чаго мы ня робім таксама і ў дачыненьні да нармальных народаў і дзяржаваў.

На думку Шлёгэрыса:

карані сёньняшняй літоўскай дзяржавы і народу ня варта шукаць нават у Вялікім Княстве Літоўскім XVII ст. Паміж Літвою Майроніса і Сьмятоны і, скажам дзяржавай Жыгімонта Аўгуста няма ніякага інстытуцыянальнага пераходу. Нават голасны Літоўскі Статут – колькі ён значыў для паўсталай у 1918 годзе Літоўскай Рэспублікі альбо сёньняшняй Літоўскай Дзяржавы? Нічога, ня меў найменшага значэньня для палітычнай ці хаця бы юрыдычнай практыкі. Гэта была і ёсьць толькі гістарычная мумія. Найважнейшаю ж прычынай поўнай пропасьці паміж архаічнай Літвой і Літвой сучаснай ёсьць зьмена самога палітычнага субстрату. У старажытнай Літве існаваў палітычны стан, але ягоны ўплыў на стварэньне сучаснай Літвы роўны нулю. Ужо ў XVII ст. гэты палітычны стан поўнасьцю адарваўся ад пляменнага літоўскага субстрату, а Вялікае Княства Літоўскае запусьціла карані не ў літоўскім, але ў польскім этнасе. Літоўскі субстрат пляменны і этнічны, з якога паўстала сучасная дзяржава і літоўскі народ існаваў "паза межамі" І-й Рэчы Паспалітай як палітычнага і дзяржаўнага твору.

Ажно чатыры вельмі значныя стагодзьдзі падзяляюць гэтыя дасьледваньні разуменьня мовы і Айчыны філёзафамі XX стагодзьдзя, ад спосабу адчуваньня сьвету шляхтай Вялікага Княства Літоўскага. За гэтыя часы сьвет радыкальна зьмяніўся, у ім зьяўляецца зусім іншая Літва – дзяржава і супольнасьць, зьмянілася таксама значна індывідуальная і супольная мэнтальнасьць чальцоў гэтай грамады, каторая сёньня атаесамляецца з гістарычнай Літвой. Гісторыкі ж стварылі ўласныя інтэрпрэтацыі Літвы.

Так сапраўды – Літва гэта прадмет не гэаграфічны, але гістарычны. І ня толькі разуменьне Айчыны нельга адзьдзяляць ад культуры, альбо дакладней кажучы ад культур. Гісторык заўжды мае вобраз Айчыны сфармаваны праз сваю эпоху. Але ў культуры апісваемых ім часоў ён мог быць іншы. Паводле сучаснага гісторыка культуры Эўропы Петэра Рытбэргэна:

пісаньне гісторыі зьяўляецца культурнай і палітычнай дылемай. У сапраднасьці гісторык непазьбежна ўключае ў свае нарысы

сваю культуру і сябе самога.

Менавіта гэта зрабіла рамантычная і патрыятычная літоўская гісторыяграфія ў XIX і першай палове XX ст. Яна стварыла вобраз Вялікага Княства Літоўскага – дзяржавы літоўскага народу, Айчыны, землі якое расьцягваліся "ад мора да мора". За найлепшых заснавальнікаў і апякуноў гэтай Айчыны прызнавалі Вялікіх Князёў Літоўскіх – Гедыміна, Альгерда, Кейстута і Вітаўта. Літоўскі народ адбудоўваючы на пачатку XX ст. сваю дзяржаўнасьць, уласна ў мінулым шукаў найважнейшых пунктаў апоры. Вобраз Вялікай дзяржавы, Айчыны Літвінаў разумеўся як падмурак народнай сьвядомасьці. Творачы гэты вобраз, яны абапіраліся на сучасных дэфініцыях этнічнага народу і яго Айчыны, пераносячы іх у мінулае.

Калі ў працэсе нацыянальнага адраджэньня фармаваўся сучасны літоўскі народ, частка шляхты, маючая свае карані ў часах Вялікага Княства Літоўскага, моўна і культурна спалянізаваная засталася па-за межамі нацыі.

Таму ў гэтым вобразе Літвы-Айчыны, які ў XIX і першай палове XX ст. стварылі літоўскія гісторыкі, так мала мейсца занялі магнаты і шляхта – будаўнічыя і абаронцы ВКЛ, словам і пісьмом славячыя Вялікае Княства Літоўскае. Без адказу засталося таксама і пытаньне як яны – чальцы шматнацыянальнага, шматмоўнага палітычнага народу, які жыў у XVI ст., якія самі аб сабе казалі: *"Мы народ Літоўскі"* альбо яшчэ карацей: *"Мы Літва"* – разумелі значэньні слова *"Айчына"*.

Гэтай праблеме прысьвечаны дадзены артыкул. Ягонай мэтай зьяўляецца перадача духу мінулых часоў, спроба зразуменьня і праз заглыбленьне ў мову крыніцаў паказаць, як паняцьце Айчыны разумелі прадстаўнікі палітычнай нацыі, якія жылі ў XVI ст. на землях Вялікага Княства Літоўскага. Шуканьне адказу на пытаньне, ці Жмудзіны народжаныя ў ваколіцах Вільні, Трокаў, Кернава, Мейшаголы ці Коўні, а таксама жыхары Навагрудка, Гародні, Менску, ці яшчэ больш адлеглых Смаленску, Кіева, Валыні, Падольля і іншых рускіх земляў Вялікага Княства Літоўскага, жывучы аддалена ў тысячы кілямэтраў, гаворачы на розных мовах, інакш аддаючы чэсьць Богу, маглі гэтак сама разумець паняцьце Айчыны і зьвязваць яго з Літвою.

У гэтую шматмоўную шляхецкую духовую прастору Вялікага Княства Літоўскага спрабавалі ўжо ўвайсьці сучасныя літоўскія дасьледчыкі літаратуры і гісторыі шаснаццатага стагодзьдзя.

Дарыюс Куоліс аналізуючы разуменьне адзінкі і Айчыны ў гістарычнай літаратуры Рэнэсансу паказвае квітнеючыя ў творчасьці таго часу тэндэнцыі і падкрэсьлівае, што асьвечаныя станы Літвы XVI ст. злучаючы тагачасную эўрапэйскую думку з традыцыямі палітычнай думкі стварылі паняцьце літоўскай дзяржаўнасьці, абгрунтоўваючы яе адрознасьць натурай народу, ягонымі звычаямі і культурай. Куоліс стараецца паказаць, як у часах Рэнэсансу фармавалася разуменьне наацыянальнай – заснаванай на своеасаблівай культуры – **дзяржаўнасьці.**

Абмяркоўваючы праблематыку разьвіцьця грамадзтва Вялікага Княства Літоўскага XVI ст., Куоліс падкрэсьлівае, што ў рэнэсансавых тэкстах постаці літоўскай палітычнай і культурнай эліты пачынаюць атаесамляцца з нацыянальнай супольнасьцю: выражаюць і бароняць інтарэсы нацыі, задумваюцца над яе праблемамі. Да ранейшага клопату аб Літоўскую Дзяржаву даходзіць клопат аб *"народ літоўскі", "народ Вялікага Княства Літоўскага", "літоўскі, жмудзкі і беларускі народ"* палітычны прадстаўлены, як сувязь трох этнакультурных супольнасьцяў, трох народаў. Сьвядомасьць быцьця грамадзянінам Княства функцыянавала разам са сьвядомасьцю быцьця Літвінам, Жмудзінам, ці Русінам. Куоліс піша:

З другога боку ў пісьменстве таго пэрыяду заўважаецца выразны ўхіл да пераадоленьня існуючых у шматнацыянальнай дзяржаве падзелаў паміж рознымі культурнымі і этнічнымі супольнасьцямі і ўнітарным грамадзянскім народам. Гэта ёсьць ухіл у падкрэсьленьні ролі нацыянальнай дзяржавы, прызнак фармаваньня грамады, якая вызнае адзіную культурную традыцыю. Бачаньне такой грамады тлумачыцца ў ажно чатырох розных мадэлях дзяржавы.

Першая адрозьненая дасьледчыкам мадэль згаджаецца з выражаным Хансам-Гэоргам Гадамэрам перакананьнем аб асаблівай місіі роднай мовы. Куоліс сьцьвярджае, што падораная Вялікаму Князю Літоўскаму першая літоўская кніжка – выдадзены ў 1547 годзе катэхізм Марціна Мажвіда (Марцінас Мажвідас, каля 1520-1563 гг.), за вызначнік літоўскага народу лічыць літоўскую мову: *nostra gens*[1] у гэтай кніжцы злучаны з *lingua Lithuanica nostra*[2]. Аўтар робіць выснову, што: *хутчэй за ўсё гэта было праграмнае перакананьне адукаванай часткі літоўскай грамады, а канцэпцыя літоўскай дзяржавы заснаваная на літоўскай мове застанецца жывая ў культуры таксама і ў пазьнейшых часах.*

Іншую мадэль культуры, паводле Куоліса, прапанавалі літоўскай грамадзе гарачыя прыхільнікі тэорыі аб паходжаньні Літвінаў ад Рымлянаў. З гэтай тэорыі ў XVIст. разьвіваецца ўгрунтаваная на аснове культуры "продкаў" – лацінскай мове, рымскім праве, лацінскай школьнай сыстэме – візія Літоўскай Дзяржавы. Канцэпцыю лацінскага паходжаньня Літвінаў баранілі ў сваіх працах Lituani Michalonis (Венцловас Мікалайціс Майшагалішкіс/Вацлаў Мікалай Мэйшагольскі альбо проста Міхалон Літвін – пер., каля 1527-1597), Вэнцэслаўс Агрыппа (Венцловас Ёнас Агрыппа/Вацлаў Ян Агрыппа – пер., каля 1525-1597), але найбольш вычарпальна гэтую канцэпцыю апісаў віленскі войт Аўгустын Ратундус Мялескі (1520-1582). Ён пераклаў на ліцінскую мову напісаны на канцылярскай славянскай мове, абвешчаны ў 1566 годзе II Статут Літоўскі. Ў дэдыкацыйным лісьце, скіраваным да Стэфана Баторыя (Вільня 20 X 1576), Ратундус піша аб сувязях лацінскай мовы і грамадзтва Літвы шаснаццатага стагодзьдзя:

Non enim ignorare Maiestatem tuam arbitror, Lituanos gente Latinos esse, ex Italique oriundos, in has regiones P. Libone, vel, ut vulgus opinatur, Palemone duce migrasse, vti non dubiae fidei scriptores probant et reliquiae Latini sermonis... Par itaque est, ut ea lingua, quae natiua et primigenia Lituanorum fuit, vna ex tribus, quas Christus Deus noster dignas suo titulo ornando iudicauit, Lituanis restituatur, passimque hic in legibus, in priuilegiis ac diplomatibu, quod ab initio Christianismi factum accepimus, in edictis, in iudiciis, in actionum formulis, in contractibus, in commerciis, in familiarbusque deniqe, si fieri possit, sermonibus frequentetur potius, quam ascita ista ac barbara cum perpetuo ac hereditario Lituanorum hoste Moscho communis, quae Latinam exulare hactenus coegit.

"Як не ест Вашай Вялікасьці невядомым, мы сьведчым, што Літоўскі народ ест Лацінскім, паходзячым з Італіі, у нашы землі прышоў пад правадырствам князя Палямона, гэта як люд просты мяркуе, падобна як і несумніўнай веры дакумэнты і рэшткі Лацінскай мовы пацьвярджаюць... Такім чынам стала быць, што гэты язык, родны і першародны Літвінам стаецца, адзін з трох, каторымі Хрыстос Бог наш Годны хацеў упрыгожыць сваё Імя[3]*, Літвінам верне, паўсюль у заканадаўстве, у прывілеях і дыпляматыі, каторыя ад пачатку прынялі*[4] *Хрысьціянства, у эдыктах, у судах і позвах, у кантрактах, у гандлі, у сям'і нарэшце, і калі можна, перавагу аддаць ужытку мовы лацінскай, чым гэтай*[5]*, прынятай як чужой, як працяг і спадчына чужой Літвінам і агульнай Маскалям, каторая пакуль Лаціну выціскае."*

Заахвочвае ўладара, каб той стараўся ўмацаваць пазыцыю лацінскай мовы ў публічным жыцьці Вялікага Княства Літоўскага:

Spes itaque nos certissima tenet, si tua Maiestas paululum adniti voluerit, ad idque iuuentutis in Latinae linguae cognitione se in Lituania exercentis studium, auctoritatem suam adhibuerit, fore ut cito Latina lingua, Lituanorum natiua ac propria, Lituanis restituatur, qua certe facilius multo et clarius leges, senatus-consulta, principalia decreta, plebiscita atque omnia publica et fori actiones scribi et laudem et gloriam huius praeclarae gentis a barbarie prorsus per omnia vindicatae, edi poterunt, atque ut alacriores ad complectendum sermonem Latinum, sibi natiuum ac genuinum Russi, tum Lituani reddantur, non abs re me facturum putaui in huius statuti initio principum Lituaniae origines et propagationes, in epitomen redactas, eodem Latino sermone, quod hactenus fecit nemo.

"Таму надзея нас праўдзівая падтрымлівае, калі Ваша Вялікасьць зажадала б ледзь-ледзь прызнаць, каб моладзь у ведах лацінскага языка ў Літве сябе ў навучаньні практыкавала, карыстаючыся сваім аўтарытэтам[6]*, каб скора язык лацінскі, родны як свой, Літвінам верне, у якім ва ўсялякім выпадку прасьцейшыя нашмат і ясьнейшыя законы, пастановы сэнату, дэкрэты Гаспадара, плебісцыты, а таксама ўсе публічныя дзеяньні, пісаныя на праслаўленьне і хвалу гэтаму найясьнейшаму*

працяг на 4-й старонцы

ПСТОРЫЯ

працяг з 3-й старонкі

народу, а чужым насуперак, усімі прынятым языком маглі карыстацца, і каб заахвочваньне ў навучаньні мовы Лацінскай спарадзіць, сабе роднай, каб і роднай зрабілася роджанаму Русінам, чы Літвінам, небеспадстаўна гэта кажу, у гэтай дэклярацыі Гаспадар Літвы можа зрабіць пачатак дзеля пашырэньня гэтай Лацінскай мовы, як гэта каротка выкладзена, што дагэтуль ніхто не чыніць."

Трэцяя, паводля Дарыюса Куоліса, мадэль грамадзтва і дзяржавы – беларуская альбо руская, якую можна вылучыць на падставе напісаных па-беларуску (на канцылярскай славянскай мове) Літоўскіх Статутаў, Кронікаў і паходзячай з Вялікага Княства Літоўскага багатай пісьмовай традыцыі на беларускай мове.

Чацьвёртая мадэль – польская зьвязаная з сармацкай культурай, якая паводле дасьледчыка абапіралася ня столькі на маніфэстацыях і акрэсьленай ідэалёгіі, колькі на практыцы штодзённага жыцьця, якая загадвала ўладарам і літоўскай шляхце XVI ст. усё часьцей прымаць польскую мову. У кантэксьце высновы Куоліса, гісторыка літаратуры ня цяжка знайсьці сувязі паміж Айчынай і мовай, дашукацца ў сьвядомасьці шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст. канцэпцыі літоўскай, беларускай ці польскай айчыны.

Творчасьць аўтараў, якія жылі ў XVI ст. ў Вялікім Княстве Літоўскім аналізуе Сігітас Нарбутас, таксама гісторык літаратуры. Аўтар падкрэсьлівае, што творы творцаў сучаснікаў Яна Радвана – творчасьць якога галоўны прадмет ягоных дасьледваньняў – пераканаўча даказваюць, што тагачаснае грамадзтва мела вызначэньне ўласнай дзяржавы, якую агульна Нарбутас выражае гэтак:

Грамадзтва Вялікага Княства Літоўскага зьяўляецца грамадзтвам трохстанавым, якое аб'ядноўвае той самы Валадар, роўныя для ўсіх правы, супольная культурная памяць, супольная культурная мова продкаў (лаціна), адзіная рэлігія і адзіны вораг – маскоўская дзяржава. Гэта ёсьць грамадзтва, альбо этнапалітычны народ, што жыве на тэрыторыі Вялікага Княства, якое валодае ўстаноўленымі ўмовамі і законамі, пацьверджанымі межамі і імкнецца да дабрабыту, які яму запэўнівае грамадзянская вольнасьць адносна права.

Славячы бацькаўшчыну ў сваёй паэме *Radivilas* (Радзівіл) Радван зьвяртае ўвагу толькі на некаторыя аспэкты літоўскай дзяржавы, пры чым за найважнейшы чыньнік, што аб'ядноўвае ўсе адзінкі ў супольнасьць і надае дзяржаве дыяхранічны характар, прызнае ўласна **тэрыторыю, валадара, ворага і культурную памяць**.

Нарбутас зьвяртае ўвагу, што Радван не раздзяляў дакладна разуменьняў народу, дзяржавы і грамадзтва, таму часта цяжка сказаць, што ён меў у думках. Але некаторыя фрагмэнты эпасу нягледзячы на ўсё даз-валяюць сьцьвярджаць, што ўжытая ў іх назва Літвы – гэтак чула сьпяваная – азначае дзяржаву, а не народ. Паводля Нарбутаса ў паэме асабліва важная роля нададзена тэрыторыі. Гэты аспэкт найлепш хіба адлюстроўвае вызначэньне бацькаўшчыны паэта тых часоў. Вось як гучыць адзін з фрагмэнтаў Radiviliady:

***ARMATUR PROMPTI PEDITES**, equitumque procellae:*
Qui Vilnam, qui culta tenent tua rura Cunasse,
Et qui littora habent, qua Nerys conditur ingens
In vada Chrononis valles diffusa perimas,
Et qui Trocorum campos, fortesque Vitebas
Late habitant, qui sunt Orsae florentis in arvis,
Qui Beresina nitens praetexit arundine ripas,
Quosque vetus pascit forissima corda Polottus.

***"ЗБРОЯЦЦА ГАТОВЫЯ ДА БОЮ** пешыя і цьма коньніцы:*
каторыя Вільню трымаюць, каторыя абрабляюць твае палеткі Кунасе,
Каторыя валодаюць берагамі, у якіх Вяльля пекна плыве,
У рацэ Нёман, даліны прасторныя зьнікаюць,
І каторыя моцныя, Троцкія і Вітабскія раўніны
Абільна засяляюць, даліны квітнеючыя ля Воршы,
Раўніны, што бліскучую Бярэзіну акаймляюць берагавым камышом,
Як і раней выхоўвае баявыя сэрцы Палота."

***QUI PRISCAM GARTYNA VIRI**, quique aequora Minsci*
Lata colunt, Lidamque legunt, Vacamque liquentem,
Erdvilonis et qui (gens Martia) campos,
Qui terras Mohilae tuas, vicinaque vertunt
Aequora, despectant et quos Orsancia tecta,
Atque quaterdenis Ozeriscia turribus audax,
Fluctus inaccessam late hanc circumsonat undis.
Non ego transierim felicis moenia Brestae,
Et priscos tractus, et parvae tecta Recitzae,
Quos Homella viros alit, et quos Moseris, et quos
Duratos pugnis belli videt Oster amoenus.

***"ГЭТА СТАРАДАЎНАГА ГОРАДНА МУЖЫ**, і мужы, што раўніны Меничыны*
Урабляюць, места Ліду будуюць, і дрыгвістую Ваку
Эрдвіл[7] (з роду Марса), што палі,
Што зямлю Магілы тваю, і суседнія вярнуў
Палі аглядаючы і Воршы паселішчы,
Як сорак Азярышчынскіх вежаў адважныя,
Непрыступныя патоку, далёка ляціць гук хваляў
Не прайшоў бы я ля шчасьлівых муроў Берасьця
І старадаўнімі трактамі і малой сялібай Рэчыцы,
Тых мужоў, што Гомля гадуе, і што Мазыр, і што
Друць, добрых на вайне, бачыць Астрог пекны."

***QUID LOQUAR OSMENIOS POPULOS?** Lastaya legentes*
Littora, qui procul hinc flavi Nemenis ad altras
Rura colunt valles, Cobriniae aequora, pulchrum
Axiacenque bibunt, ubi sunt pinguissima rura.
Egregiis pascit quos agris Mscislaus, et quos
Vla viros, iam tum Moschorum sanguine in undas,
Oscibus humanis campusque Ivanscius albens,
Keystutique necis Crevus vestigia servans:
Slonimiique viri, Volcoviscumque colentes,
Et Rusci, et mortem haud metuentes Iazyges, olim
Caniciem galea premere, armis pectora sueti.
Qui vitreae valles exercent vomere Suentae,
Et quos dives apum, et Cereris Samogetia misit,
Volcomeraque manus, nec non Braslavia pubes.
Multae praeterea gentes, populique feroces,
Quos tunc Batthorheus magna ditione regebat.

***"ШТО МАГУ Я КАЗАЦЬ АБ ЛЮДАХ АШМЯНСКІХ?** Lastaya legentes[8]*
Берагі белакурага Нёману, што здалёк тут ад аднаго да другога
Вясковыя палі абрабляюць, Кобрыня даліны, найпрыгажэйшыя
Axiacenque[9] пюць, дзе ёсьць найтлусьцейшыя вёскі.
Выдатныя, што пасьвяць землі Амсьціслава і што
Улы мужы, жадаў бы каб кроў Маскалёў на хвалях,
А косткі людзкія на Іванполі бялелі,
І Кяйстутава забоства сьляды назірала Крэва:
І Слонімскія мужы і насельнікі Ваўкавыску,
І Русіны, і не баязьлівыя да сьмерці Яцьвягі, калісьці
Сівізну яго прыціснуўшы шоламам, а грудзі як звыкла зброяй.
Як шкло бліскучыя хвалі кідае Сьвятая[10],
Et quos dives apum, et Cereris Samogetia misit[11],
Вілкамерскую сілу, як і Браслаўскую моладзь,
З дапамогай якіх тады Баторы Вялікія землі сабе падпарадкаваў."

Мы бачым, што ў сваім творы Радван "зьмясьціў" усё Вялікае Княства Літоўскае, яго тэрыторыі надаў характар ўнітарнай прасторы, якую апэруючы сучаснымі катэгорыямі можна было б атаясаміць з бацькаўшчынай.

Юратэ Кяўпене

тлумачыў – АСК паводле «Łacina jako jezyk elit», навук.рэд. Jerzy Axer выд. DiG Варшава, 2004

---

[1] *nostra gens* – наш народ (тлум.)
[2] *lingua Lithuanica nostra* – наша літоўская мова (тлум.)
[3] маецца на ўвазе надпіс на Крыжы Госпада, зроблены на трох мовах: па-арамэйску, па-грэцку і па-лацінску (тлум.)
[4] адхіленьне ў тэксьце аб стасунку Літвінаў да Хрысьціянства (тлум.)
[5] хутчэй маецца на ўвазе кірылічная графіка, а ня мова (тлум.)
[6] аўтарытэтам Гаспадара (тлум.)
[7] Эрдвіл – магчыма Радзівіл (тлум.)
[8] незразумелы кантэкст (тлум.)
[9] незразумелы кантэкст (тлум.)
[10] рака Сьвятая ў паўночнай Літве (тлум.)
[11] незразумелы кантэкст (тлум.)

ІДЭІ

ДА ПЫТАНЬНЯ АБ СПРОБАХ РЭСТАЎРАЦЫІ ВКЛ У КАНЦЫ XIX-XX СТАГОДЗЬДЗЯХ

ЗЬВЯРТАЮЧЫСЯ ДА ПЫТАНЬНЯ РЭСТАЎРАЦЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА належыць перад усім акрэсьліць два падставовыя элементы характару ВКЛ, якія прысутнічалі ў магчымых варыянтах аднаўленьня, якія абодва зьяўляюцца ўмовамі ў роўнай ступені неабходнымі ў нашым разуменьні для пытаньня аднаўленьня ВКЛ.

Першая ўмова: тэрытарыяльнае аб'яднаньне ўсіх земляў ВКЛ у адзін дзяржаўны арганізм.

Другая ўмова: рэстаўрацыя манархічнага ладу ў дадзеным дзяржаўным арганізьме, альбо разам з ім.

Акрэсьліваючы першую ўмову, яна ў нашым разуменьні павінна была ў вызначаным пэрыядзе разгляду прызнаваць тэрытарыяльнае адзінства





Баляслаў Ялавецкі

земляў ВКЛ на стан 1772 году. Гэта значыць у ВКЛ павінныя былі б увайсьці Смаленск, Вітабск, Мсьціслаў, Берасьце, Наваградак, Трокі, Вільня, Полацак і Жмудзь. Акрэсьленыя межы ёсьць неабходным мінімумам патрабаваньняў дадзенага крытэрыя. Адкіданьне хаця б аднага са згаданых элемэнтаў азначала б крыўду недапушчальнай колькасьці колішніх паддадзеных ВКЛ, пазбаўляючы іх сувязяў з інтэгральна злучанай цягам вякоў рэштай.

Істотнай пагрозай для падобнага погляду была няправільна зразумелая ідэя вузкаэтнічнага адраджэньня, якая меркавала збурэньне традыцыйных дзяржаўных арганізмаў, альбо брак іх адбудовы як у дадзеным выпадку, дзеля карысьці этнічна аднародных наватвораў. Ідэя гэтая нарадзіўшыся ў XIX стагодзьдзі давяла таксама да непераадольных перашкодаў і ў справе адбудовы ВКЛ і Рэчыпаспалітай. Карысталіся ёй і польскія эндэкі і іх русінскія, жмудзкія і крыўска-літоўскія аднадумцы. Гэта давяло да нябачнага дагэтуль завостраньня адносінаў паміж братнімі народамі, прасунутага нават да фізычнага вынішчэньня.

На карысьць геапалітычнай канцэпцыі Літвы дзейнічалі на пачатку XX стагодзьдзя наступныя палітычныя сілы:

"Краёвая опцыя Літвы і Беларусі"

Польскія незалежніцкія сацыялісты з часткаю іхных ідэйных пабрацімаў "украінцаў", "беларусаў" і "літоўцаў".

Частка "літоўскіх" нацыяналістаў у сваіх пачатковых плянах баючыся слабасьці этнічна балцкай дзяржавы.

Трэба адзначыць, што да опцыі ВКЛ магла б яшчэ далучыцца і частка кансэрватыўных інтэлектуалаў Польшчы, што вызнавалі "Ягэлёнскую" ідэю ў новапаўсталай Польшчы. Як і тое, што польская эндэцыя ў Літве павінна была браць пад увагу асаблівасьць рэгіёну і адпаведна зьмякчаць сваю палітычную рыторыку ў параўнаньні з "Каронай".

Краёвая опцыя Літвы і Беларусі.

Краёвую опцыю Літвы і Беларусі рэпрэзэнтавалі буйныя землеўдальнікі, якія паходзілі з тэрыторыі былога ВКЛ, захоўвалі ў сваёй уласнасьці большую частку тэрыторыі гэтае дзяржавы і ў палітычным сэнсе называлі сябе "палякамі". Паводле дасьледчыка "краёвасьці" А.Смалянчука[1] "...напрыканцы XVIII, працягу XIX стст. "польскае пытаньне" зьяўлялася барацьбою палітычнай і культурнай эліты гістарычнай Літвы за адраджэньне Рэчы Паспалітай, як незалежнай фэдэратыўнай дзяржавы.

Гэта быў пэрыяд рэчпаспалітаўскага патрыятызму, які звычайна апранаўся ў польскую вопратку, бо разуменьне "паляк" зьяўлялася пераважна палітонімам і станавай катэгорыяй. Для сьвядомасьці гэтай эліты была характэрная пэўная падвойная сьвядомасьць: *gente Lithuanus (vel Ruthenus), natione Polonus*. У межах літвінства, як складовай часткі польскага (*рэчпаспалітаўскага*) патрыятызму ў гэты час адбываўся працэс "беларускага" культурнага накапленьня...". Яшчэ больш закончаны выраз атрымала ідэалёгія ў "Нацыянальным катэхізме" Б. Ялавецкага, які ўяўляў адказы на шэраг актуальных пытаньняў з жыцьця краю. Ўслед за Р. Скірмунтам ён таксама сьцьвярджаў "адзінства крыві літоўцаў, палякаў, беларусаў, а ў Інфлянтах яшчэ і латышоў, якія належаць да адзінай нацыі "літоўцаў"... Крэўская унія, на ягоную думку, таксама паспрыяла фармаваньню адзінай беларуска-літоўскай культуры, што прывяло да распаўсюду адзіных звычаяў і адзінай нацыянальнай этыкі...". Ялавецкі сьцьвярджаў: "Жыхар Палангі, Коўна, Вількаміра, Сьвянцянаў альбо Вільні, Гародні, Наваградка і нават Менску зьяўляецца літоўцам, незалежна ад таго, гаворыць ён па-літоўску", "па-польску" альбо "па-беларуску". Ўвесь уклад яго жыцьця, звычаяў, сам сэнс ягонага існаваньня настолькі паўсюдна аднолькавы, што акрамя мовы цяжка заўважыць якую-небудзь іншую розьніцу. А гэта пацьвярджае, што на ўсім абшары Літвы жыве адна нацыя спаяная на працягу стагодзьдзяў супольнай крывёю "літоўцаў", "палякаў" і "беларусаў"...". Пэўна цяжка знайсьці больш яскравае акрэсьленьне факту прысутнасьці адзінага народу, ва ўсялякім разе палітычнага, які з пэўным часам мог стаць і нацыянальным.

Біскуп Эдвард фон Ропп

Практычным крокам да ўвасабленьня "краёвай канцэпцыі" ВКЛ мела быць дзейнасьць "Канстытуцыйна-Каталіцкай Партыі Літвы і Беларусі", існаваўшай у 1905-07 гг., заснавальнікам якой стаў віленскі біскуп – барон Эдвард фон Роп, які паходзіў з Інфлянтаў. Нажаль пад націскам забароны ўладаў арганізацыя ўрэшце распалася. У чэрвені 1907 г. была ўтвораня "Краёвая партыя Літвы і Беларусі" найбольш актыўным яе дзячом быў Станіслаў Ваньковіч. Варта таксама спыніцца на поглядах канцэпцыі Краёвай партыі, якую высунула Канстанцыя Скірмунт. Паводле яе Краёвая партыя змагалася за вылучэньне беларускіх і літоўскіх земляў у асобную адміністрацыйную адзінку з самакіраваньнем. Яе палітычным цэнтрам станавілася Вільня, а Коўня і Менск утваралі два культурныя цэнтры.. На тэрыторыі Віленшчыны, Гарадзеншчыны і Ковеншчыны К.Скірмунт лічыла магчымым будаваць працу

працяг на стар.6

ІДЭІ

Краёвай партыі на глебе каталіцызму, а на Меншчыне – на падставе праграмных установак[2]. У кастрычніку 1907 г. у якасьці альтэрнатывы быў створаны "Польскі Краёвы Зьвяз Працы".

Што датычыць дзяржаўнай арыентацыі кансэрватыўнага крыла "краёўцаў", дык тут мы ня бачым яснага яе ўяўленьня. "Краёўцы" з прычыны іх угодлівасьці маскоўскай адміністрацыі не маглі высоўваць палітычных патрабаваньняў. Пытаньне аб аўтаноміі краю альбо *дэ-факта* ВКЛ, яны адсоўвалі на няпэўную будучыню. Іх пазыцыя была кансэрватыўнай з прычыны валоданьня вялікімі абшарамі і ўласнасьцю на іх. Тым ня менш "краёўцам" належыцца вялікая пашана з боку сёньняшніх манархістаў за іх рэчаісную прапаганду літоўскага сьветапогляду і падтрымку літоўскасьці ў палітычным сэнсе на ўсёй трэрыторыі былога ВКЛ.

Польскія незалежніцкія сацыялісты

Польскія незалежніцкія сацыялісты, нягледзячы на агульную шкоднасьць сваёй дактрыны, тым ня меней праз своеасаблівы "інтэрнацыяналізм" былі больш схільныя да рэанімацыі фэдэратыўнай мадэлі Рэчы Паспалітай. Пры гэтым лідар баявога крыла Польскай Сацыялістычнай Партыі – Юзэф Пілсудскі, які паходзіў з Віленшчыны і ў першым пасьведчаньні асобы быў запісаны як "беларус", жадаў, перад усім, выкарыстаць сацыялістычную справу для сваіх гэапалітычных канцэпцыяў, пра што сьведчыць яго пазьнейшае выказваньне, што ён "выйшаў з цягніка сацыялізму на прыпынку Незалежнасьць", і зрабіўшы пераварот у траўні 1927 году фактычна праводзіў кансэрватыўную палітыку – т.зв. "санацыю", дзеля чаго яго падтрымала віленскае асяродзьдзе землеўладальнікаў, згуртаванае вакол С.Цата-Мацкевіча.

У 1919 годзе Пілсудскі будучы галоўнакамандуючым польскіх узброеных сілаў і адначасова "Начальнікам Польскай Дзяржавы" выдаў адозву да насельнікаў былога ВКЛ, у якой між іншым кажа: "Палажэньне безупыннай няволі, якую я, нарадзіўшыся на гэтай няшчаснай зямлі добра ведаю, павінна быць урэшце зьнішчана, і хоць раз у гэтым, як бы Богам забытым краі, павінна запанаваць свабода і права вольнай, нічым не зьвязанай гутаркі аб сваіх патрэбах..."



Юзэф Пілсудскі

Канцэпцыя Післсудскага была ўгрунтаваная на ідэі зьяднаньня ўсіх земляў ВКЛ ў трох кантонах, паводле ўзору Швайцарыі: "літоўскім" з цэнтрам у Коўні, "польскім" – з цэнтрам у Вільні і "беларускім" – з цэнтрам у Менску, пры чым гэтая сьціслая фэдэрацыя павінна была знаходзіцца ў фэдэратыўнай уніі з Польшчай. У сваёй канцэпцыі Ю. Пілсудскі абапіраўся на, брацкія яму, сацыял-дэмакратычныя колы на землях ВКЛ: на Ўкраіне – на Сымона Пятлюру, на Беларусі – на створаную Вайсковую Камісыю на чале з К. Езавітавым, а пасьля на гэн. С. Булак-Балаховіча, які лічыў сябе літвінам. Альтэрнатыўны праект аднаўленьня супольнага дзяржаўнага існаваньня земляў ВКЛ рэпрэзэнтавалі роднасныя ППС колы на Літве і Беларусі, што ў 1916 годзе падпісалі разам з прадстаўнікамі ППС, дэклярацыю аб утварэньні "Канфэдэрацыі Вялікага Княства Літоўскага", якая ўсё ж ня была ажыцьцёўлена.

Канцэпцыя Ю.Пілсудскага не знайшла свайго ўвасабленьня з прычыны недахопу гатовасьці з боку польскага грамадзтва да новых ахвяраў на карысьць суседніх земляў, што стала прычынай перамогі мінімалістычнай *эндэцкай*[3] канцэпцыі, якая меркавала анэксію часткі земляў ВКЛ, з перавагай каталіцкага насельніцтва ў межы новай Польшчы.

Балцкая ініцыятыва ў аднаўленьні ВКЛ, якая заключала манархічны прынцып[4]

Ня толькі рэпрэзэнтанты "славянскай" супольнасьці былога ВКЛ, але і іх "балцкія" браты, асабліва на пачатку, разважалі над магчымасьцю аднаўленьня Вялікага Княства. Найбольш істотнай спробай у дадзеным накірунку была ініцыятыва Салямонаса Банайціса[5], які разам з А. Дамброўскім-Якштасам, Краўчунасам і яшчэ 6 асобамі, утварылі ў 1919 г. Галоўны Літоўскі Нацыянальны Камітэт. Камітэт выдаў адозву да грамадзянаў і склаў "Падставы Канстытуцыі самаўраднага ВКЛ". У адозве ішла гутарка аб 7-мільённым народзе, што жыве на тэрыторыі трох аўтаномных адзінак "Латвіі", "Літвы" і "Беларусі". Згодна з канстытуцыяй Вялікі Князь станавіўся галоўнакамандуючым, кіраўніком выканаўчай улады і павінен быў вызнаваць каталіцызм. У выпадку выгасаньня дынастыі аб выбары новай меў вырашаць т.зв. Вялікі Сойм.

Працяг "Краёвай ідэі Літвы і Беларусі" ў міжваеннай Польшчы

Станіслаў Цат-Мацкевіч

Нягледзячы на відавочнае пагаршэньне адносінаў паміж трыма апрычонымі народамі гістарычнай Літвы: "палякамі", "беларусамі" і "літоўцамі", краёвая ідэя працягвала сваё жыцьцё ў асяродзьдзі віленскіх зямянаў, якое рэпрэзэнтаваў вядомы польскі публіцыст Станіслаў Цат-Мацкевіч. Цат ня быў поўнасьцю палітычна сьвядомым "Літвінам", тым ня менш выказваў сапраўдны краёвы погляд, напрыклад у пытаньні аўтаноміі для Віленскага Краю ў межах II Рэчы Паспалітай, разумеючы пад дэцэнтралізацыяй рэгіяналізм альбо захаваньне істотных асаблівасьцяў краю. Акрамя таго ён быў глыбокім кансэрватарам, традыцыяналістам і манархістам, што зьяўляецца надзвычай дарагой для нас якасьцю.

Асабліва цікавым нам падаецца разважаньне датычнае мінулых дынастыяў, што кіравалі польска-літоўскай дзяржавай, як і магчымых прэтэндэнтаў на польска-літоўскі трон.

Гэтак Ягэлёнаў Мацкевіч лічыў за выбітную дынастыю, што выказвала ва ўнутранай палітыцы, як і ў зьнешняй, ня толькі пачуцьцё сілы, але і адказнасьці за лёс дзяржавы. Мацкевіч далей казаў: "Адзін выбітны чалавек можа быць дыктатарам, але калі таленты, геній насьледуе сын, унук, праўнук і гэтак далей, то мы кажам аб вялікай дынастыі. Менавіта гэтак было з домам Гедыміна."[6] На думку Мацкевіча менавіта нашчадкі Гедыміна, засеўшы на польскім троне, маглі кіравацца мерай і пачуцьцём, ня губляючы пры гэтым аўтарытэту таксама як сярод уласных паддадзеных, гэтак і ў Эўропе.

Датычна кандыдатураў Цат пісаў: "Не кажу, каб гэтага кандыдата праклямаваць сёньня альбо заўтра. Але пасьлязаўтра павінна ўсё ж настаць і кожны манархіст будзе чакаць яго з нецярплівасьцю. Мы павінныя ўсё ж паказаць рэальную мэту нашай тэорыі, нашай ідэі"[7].

Цат шукаў менавіта такога кандыдата дзеля краю, які будзе здольны вылушчыць з народу моц, падняць дзяржаву да рангу імпэрыі. Перадусім ён думаў аб дзьвюх княскіх семьях – Радзівіллах і Сапегах. Але ўсьведамляў сабе, што вылучэньне адной з іх будзе натыкацца на няпрыязнасьць іншай. Таму Цат думаў таксама аб сувязі Польшчы з вялікай чужаземнай палітычнай сілай. Тут маюцца на ўвазе ангельскія, вугорскія і нават італьянскія кандыдатах (1925). Калі ён пісаў аб "вугорскім" кандыдаце, дык меў надзею, верыў, што Рэгэнт Вугоршчыны – адмірал Міклаш Хорці, які зрабіў са сваёй краіны апору рэакцыі, верне на трон Габсбургаў. Зрэшты за Габсбургаў, як за будучых польска-літоўскіх каралёў было найбольш аргумэнтаў[8]:

Традыцыя Галіцыі і Франц-Ёзэф, якога ён акрэсьліў як рэаліста і дасьведчанага палітыка, які можа быць сябрам Польшчы і палякаў. Бо яшчэ ў 1876 г. ў Львове, пад кіраўніцтвам Князя Адама Сапегі, паўстаў камітэт, які меў сваёю мэтай прыгатаваньне паўстаньня. Пасьля яго перамогі і вяртаньні незалежнасьці, Каралём Польшчы павінен быў стаць прадстаўнік

працяг на стар.7

НОРАВЫ

ТРАДЫЦЫЙНЫ ПОГЛЯД НА ҐЭНДЭРНЫЯ СТАСУНКІ

Хрысьціянскія асновы

Аснову і пачатак традыцыйнага погляду на стасункі складае біблійная аснова. Яшчэ ў Старым Запавеце, дзе апісана выгнаньне Адама і Эвы з раю, зазначаецца: *Жонцы сказаў: множачы памножу скруху тваю ў цяжарнасьці тваёй; у хворасьці будзеш нараджаць дзяцей; і да мужа твайго цяга твая, і ён будзе валадарыць над табою. А Адаму сказаў: за тое, што ты паслухаўся голасу жонкі тваёй і еў з дрэва, пра якое Я наказаў табе, сказаўшы: "ня еш з яго", праклятая зямля за цябе; са скрухаю будзеш карміцца з яе ва ўсе дні жыцьця твайго.*

(Кн. Быцьця 3, 16-17)

Новы Запавет ня зьнёс старых прыказазаньняў і апостал Павал ізноў жа кажа:

Жонкі, упакорвайцеся сваім мужам, як Госпаду, бо муж ёсьць галава жонкі, як і Хрыстос – галава Царквы, і Ён жа Збаўца цела. Але як Царква слухаецца Хрыста, так і жонкі сваіх мужоў ва ўсім. Мужы любіце сваіх жонак, як і Хрыстос палюбіў Царкву і аддаў Сябе за яе.

(Пасланьне апостала Паўла да Эфэзыянаў 5, 23-25)

Зыходзячы з гэтых словаў Бібліі трэба адзначыць інтэгральны погляд хрысьціянства на стасункі мужчыны і жанчыны і на іх асобныя ролі ў дадзеных стасунках. Што маецца на ўвазе пад інтэгральнасьцю? Менавіта лёґіка і нязьменнасьць гэтых стасункаў і іх фундамэнтальны характар для будаваньня грамадзтва. Лёґіка палягае на тым, што жывучы ў раі Адам і Эва першапачаткова былі раўнапраўнымі асобамі, а фармальная нераўнапраўнасьць увайшла ў наша жыцьцё разам зь *першародным грахом*. Менавіта ён стаў прычынай пакараньня на мужчыну і жанчыну, у выніку якога іх функцыі і зьвязаныя з гэтым правы кардынальна зьмяніліся. Гэтак ад пачатку Адам ня мусіў потам і крывёю зарабляць штодзённы хлеб, і адпаведна ўсё меў гатовае, што давала яму свабоду выбару. Эва ж ад пачатку мела тую перавагу, што ня мусіла падпарадкоўвацца Адаму і пры памнажэньні роду ня несла тых мукаў як зараз і мела свабоду самарэалізацыі. У выніку Божага рашэньня, згодна з якім кожны грэх мае быць пакараны, стасункі гэтыя падлеглі зьменам: статус Эвы, калі можна гэтак сказаць перастаў быць незалежным, а быў прыведзены ў залежнасьць ад Адама. Адаму ж была дадзена іншая функцыя, а менавіта – здабыцьцё штодзённага хлебу, што сёньня выражаецца ў прафэсійнай дзейнасьці, кар'еры і г.д.

Новы Запавет вуснамі сьв. апостала Паўла даводзіць нязьменнасьць гэтай сытуацыі і ў новым часе. Хрыстос прынёс чалавеку збаўленьне пасьля сьмерці. У зямным існаваньні стасункі мужчыны і жанчыны былі зьмененыя ў тым пляне, што было забароненае шматжэнства, якое існавала ў Старым Запавеце. Сам характар гэтых стасункаў у сям'і і адпаведна з гэтым рэалістычнае іх разуменьне не зьмяніліся. Згодна з гэтым разуменьнем асноўнай роляй жанчыны было нараджэньне і выхаваньне дзяцей у маленстве, вядзеньне хатняй гаспадаркі і дробных гандлёвых апэрацый. Роляй мужчыны ёсьць фінансавае забесьпячэньне сям'і, ажыцьцяўленьне грамадзка-палітычных функцый і функцый абароны, выхаваньня дзяцей у юнацкім узроьсце (перад усім хлопцаў) а таксама буйных гандлёвых апэрацый.

Крызыс гэндэрных стасункаў у XX ст.

Крызыс ґэндэрных стасункаў у XX ст. быў выкліканы пераасэнсаваньнем ролі жанчыны фэміністычнымі групоўкамі, згодна зь якім жанчына мусіла б атрымаць роўныя функцыянальныя правы і мажлівасьці самарэалізацыі. Пры гэтым ўвага не зьвярталася на натуральныя перадумовы[1] і функцыянальныя схільнасьці[2]. Роля ж мужчыны ня стала, а хутчэй за ўсё і ня можа быць пераасэнсавана ў сілу немагчымасьці збурэньня пэўных аб'ектыўных законаў і агульнага парадку рэчаў. У выніку паўстала канфліктная сытуацыя, калі меншасьцёвая група – фэміністкі і іх прыхільніцы спрабуюць кардынальна зьмяніць існуючы парадак, а пасыўная большасьць альбо не падтрымліваюць усіх іхных пастулятаў, або ставяцца да іх нэгатыўна. Трэба адзначыць, што ў падтрымку фэміністычных пастулятаў выступаюць перад усім лібэралы, сацыялісты і камуністы, у той час як у кансэрватыўным асяродзьдзі падобныя ідэі зьяўляюцца непапулярнымі. Кансэрватары выступаюць за захаваньне традыцыйнага падзелу роляў мужчыны і жанчыны як у сям'і, гэтак і ў грамадзтве.

Сярод асноўных лёзунгаў фэмінізму ёсьць "вызваленьне жанчыны". Ён хіба што найпаўней адлюстроўвае сутнасьць гэтай ідэі, бо пад "вызваленьнем" разумеецца рэвізыя адносінаў паміж мужчынай і жанчынай ва ўсіх галінах, ня выключаючы прыватнай[3]. Асаблівую папулярнасьць у межах фэміністычнай ідэі атрымала плынь прапарцыйна роўнага ўдзелу мужчын і жанчын у той ці іншай галіне грамадзка-палітычнай дзейнасьці і ў працэсе прыняцьця тых ці іншых рашэньняў. Асабліва востра акрэсьліваецца канфрантацыя паміж фэмінізмам і кансэрватызмам па лініі права на жыцьцё. Гэтак "фэміністкі-абарцыяністкі" прапагандуюць ідэю права выбару жанчыны ў пытаньні нараджэньня пачатага дзіця. Пазыцыя хрысьціянскіх цэркваў, асабліва праваслаўнай і каталіцкай, вельмі цьвёрдая і акрэсьлівае аборт, як забойства, што зьяўляецца адным з галоўных грахоў. Ускосным плёнам фэмінісцкай ідэалёгіі сталася тзв. "сэксуальная рэвалюцыя", якая адкрыта адбылася ў Заходняй Эўропе у канцы 60-х гадоў, а ў СССР у гарадзкім асяродзьдзі на працягу 70-х гадоў. Вынікам гэтага працэсу сталася

Працяг на стар.12

ДА ПЫТАНЬНЯ АБ СПРОБАХ РЭСТАЎРАЦЫІ ВКЛ У КАНЦЫ XIX-XX СТАГОДЗЬДЗЯХ

Габсбургаў. Кандыдатура аднаго з Габсбургаў, а менавіта Караля Габсбурга з Жыўца ўжо вылучалася, як магчымая на канфэрэнцыі ў Спа, дзе Імпэратар Прусіі Вільгэльм II казаў кн. Янушу Радзівіллу аб аўтаномнай Польшчы ў якасьці трэцяга суб'екта фэдэрацыі, злучанай з Аўстра-Вугорскай манархіяй.

Высновы

На жаль ніводная з узгаданых ініцыятываў альбо ідэяў не была дасканалая і не меркавала аднаўленьне г.зв. "старога рэжыму" у сэнсе ВКЛ, г.зн. не меркавала спасылацца на ВКЛ ня толькі ў культурным і сьвядомасным пляне, але і ў юрыдычным. Усе спробы былі свайго роду новаўтварэньнямі, хаця на наш погляд на пачатку XX ст. яшчэ існаваў шэраг умоваў, якія дазвалялі безбалюча аднавіць дзейнасьць дзяржаўных ворганаў ВКЛ, і ажыцьцявіць рэстаўрацыю. Паводле нашага меркаваньня бліжэй за ўсіх да істоты аднаўленьня ВКЛ падыйшлі "опцыя краёвая" ў сэнсе гэапалітычным і тэрытарыяльным; Станіслаў Цат-Мацкевіч у сэнсе палітычнага ладу і кандыдатуры магчымага манарха; "Балцкая ініцыятыва" ў выпрацоўцы канкрэтных дакумэнтаў, у дадзеным выпадку канстытуцыі і акрэсьленьня межаў ўлады манарха. Мы са свайго боку, ўдзячныя за высілкі ўсіх сілаў, якія працавалі для краю, для нашага ВКЛ, і будзем старацца, ўлічыўшы зробленыя памылкі, усё ж зрэалізаваць сапраўдную рэстаўрацыю Вялікага Княства.

І няхай нам у гэтым дапаможа Госпад Бог!

Аляксандар Ян Стальцоў-Карвацкі

[1] А.Смалянчук; Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. Гродна, 2001

[2] А.Смалянчук; Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. Гродна, 2001

[3] *эндэцкай* – маецца на ўвазе прыналежнасьць да польскай партыі Нацыянальных Дэмакратаў, альбо у неафіцыйным скароце *эндэцыі*

[4] тут не спыняемся на спробе асаджэньня Міндаўга II на троне ВКЛ, бо гэта патрабуе шырэйшага разгляду

[5] Konstytucja Wielkiego Księstwa Litewskiego 1919 roku; Zenowiusz Ponarski/Białoruskie Zeszyty Historyczne: N 12/1999; Białystok, s.194

[6] A.Górski; Władza polityczna w myśli Cata-Mackiewicza; ARCANA, Kraków 1999

[7] A.Górski; Władza polityczna w myśli Cata-Mackiewicza; ARCANA, Kraków 1999

ГІСТАРЫЧНАЯ ФІЛЯЗОФІЯ

Гэты артыкул уяўляе сабой урывак з кнігі польскага філёзафа Фэлікса Конэчнага "Polskie Logos a Ethos", выдадзенай у 1921 г. Фэлікс Конэчны вядомы сваёй арыгінальнай канцэпцыяй вызначэньня цывілізацый, паводле якой эліта Польшчы і Літвы належала да лацінскай цывілізацыі, немцы да візантыйскай, а Масква да славяна-туранскай. Паводле Конэчнага цывілізацыі ня могуць быць мяшаныя, бо пры такой спробе ніжэйшая заўжды выціскае вышэйшую. Пераклад зроблены паводле выданьня "*Wydawnictwo Antyk Marcin Dybowski*" Reprint Poznań 1921 Warszawa Ksiegarnia Św. Wojciecha – пер. АСК

POLSKA WOBEC LITWY
ПОЛЬШЧА АДНОСНА ЛІТВЫ[1]

ЛІТВА БЫЛА АЖ ДА 1791 Г. НЕЗАЛЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВАЙ. Адзьдзелы не польскага, але Літоўскага войска там стаялі, а грамадзкія даходы ішлі не ў польскі, але ў літоўскі скарб. Літвін плаціў падаткі на ўтрыманьне **ўласнай** дзяржавы і праліваў кроў за незалежнасьць Вялікага Княства Літоўскага. Не панавалі палякі над Літвою! Літва сама давала сабе рады аж да 1791 г. маючы ўласнае войска, ўласныя міністэрствы, ўласны скарб. Урад Каралеўства Польскага не быў прынамсі ўрадам для Літвы! Канцлер, падскарбі ці гэтман каронны не маглі загадваць ў Літве, бо там былі асобныя: літоўскі гэтман, літоўскі падскарбі, нават канцлер літоўскі. Літва была кіравана так, як ёю кіравалі... Літвіны. Калі ж там былі кепскія ўрады дык гэта было нэгатывам літоўскай гісторыі, а ня Польскай: гэта так – уласнай **літоўскай** гісторыі.

Ад павятовага падсудка аж да канцлера вялікага, ўся ўрадавая іерархія была ў літоўскіх руках, не атрымліваючы з Польшчы ніякіх даручэньняў, ні перад кім у Польшчы не адказваючы, падуладная ўласным **літоўскім** міністрам у сфэры "каралеўскае" службы, а ў сфэрры "земскай" уласным карпарацыям і аўтаномным інстытутам.

Супольнымі былі для Польшчы і Літвы толькі два чыньнікі грамадзкага жыцьця: кароль і вальны сойм.

Супольнасьць гэтая паўстала з таго, што **літоўская** дынастыя панавала над Польшчай. Паколькі гаворка ідзе пра гэты чыньнік дык атрымліваецца, што Літва была вышэй за Польшчу. Таксама Ягэлёнская дынастыя ня раз давала адчуць Польшчы сваю літоўскую перавагу. Шматразова трэба было прыстасавацца да Літвы, асабліва падчас праўленьня Казімера Ягэлёньчыка і Аляксандра. Умовы аб супольны выбар манарха захоўваліся сьвята з польскага боку, калі Літва тым часам колькі разоў накідвала Польшчы манарха. Ставячы польскіх выбарцаў перад фактам нібыта традыцыя склалася, што кароль Польшчы павінен быў быць перад усім Вялікім Князем Літоўскім.

Бо гэты супольны манарх бываў як правіла больш залежным ад сваіх літоўскіх паддадзеных, чым ад польскіх; прынамсі так бывала, што больш трапляў пад літоўскія ўплывы. Таму дэмакратычная Польшча ў XVI ст. і спрабуючая дэмакратызаваць Літву сама станавілася праз літоўскія і рускія ўплывы алігархічнай цягам наступнага стагодзьдзя. А ці ж галоўныя алігархі нашых супольных дзеяў былі паддадзенымі Кароны? Літоўскія панове бывалі наймагутнейшымі пасьля Караля, Караля абмяжоўваючымі і ня раз дыктуючымі яму варункі. Ніхто ня здолее ўзгадаць аніводнага роду з Кароны, які б меў у Літве прыхільнікаў і аказаў уплыў на літоўскія справы; але не мажліва сабе ўявіць нават найкарацейшага падручніка польскай гісторыі без разьдзелу аб літоўскім магнацтве.

Вальны сойм быў супольны, польска – літоўскі. Але і сойм больш зьведваў літоўскіх уплываў, чым сам на Літву ўплываў. Ніколі ня імкнуўся да правядзеньня аднастайнасьці ў абодвух дзяржавах па над тое, чаго Літва сама жадала. Статут літоўскі і адмысловыя некаторыя літоўскія ўрады засталіся недатыкальныя.

Шляхта Вялікага Княства паўстала найперш з родаў, якія былі літоўскімі этнаграфічна. Гэта патомкі далейшых сваякоў Гедыміна, родаў азначаных у акце ўніі гарадзельскай. Гэты найстарэйшы пласт шляхты Вялікага Княства пашырыўся троху праз гэрбавыя і каралеўскія прызначэньні, але шэрагі яго падвоіліся праз набыцьцё праваслаўныя баяраў (1434 г.). Ня польская, але руская этнаграфічна шляхта дамінавала па пэўным часе ў абшырных дзяржавах Вялікага Княства Літоўскага.

Дапушчэньні аб значным наплыве польскай шляхты ў Літву скарачаюцца ў гістарычных досьледах да такога мінімуму, што шчупласьць гэтага наплыву на этнаграфічныя літоўскія тэрыторыі ажно зьдзіўляе! Польская калянізацыя была, але на Вітабшчыне, Смаленшчыне і нават на паваенных пустках. На этнаграфічную Літву, польскі шляхціц мала гарнуўся, бо ня ведаў гаспадаркі, якую там трэба было весьці, то бок, лясное, і ня мог ужыцца ў адносіны абапёртыя на суровым захоўваньні сацыяльнай іерархіі. Мазавецкі шляхцюк паміраў з голаду, але галаву трымаў горда, пад час, калі ў Літве заможны землеўладальнік дазваляў яшчэ ў XVIII ст. быць у паняверцы ў магната. Польская літаратура XVI ст., заклікаючы Літвінаў да больш сьціслай ўніі за галоўны аргумэнт ужывала пэрспэктыву, што праз гэта павялічыцца сацыяльная незалежнасьць і асабістая годнасьць літоўскай шляхты адносна вяльможаў Вялікага Княства. Таму ажно да Люблінскай уніі польскі шляхціц губляў бы на перасяленьні ў Літву, і аж да канца XVI стагодзьдзя няма гутаркі аб якой-небудзь эміграцыйнай плыні ў гэтыя краі. Былі тры падставы для іміграцыі этнаграфічна польскай масы:

а.) Вайсковыя
б.) Арэнда
в.) Праз жаніцьбу і спадчыну.

Ад XVII ст. ўсё меней становіцца сярэдне–заможных чыста польскіх шляхецкіх родаў, альбо чыста літоўскіх.

Амаль усе мелі ў продках узаемна "Koroniarzy" і "Літвіноў". Тут аднак іміграцыя ўраўнаважваецца на абодва бакі, бо з такою самай ступеньню верагоднасьці мог стаць Літвін дзедзічам у Кароне, як і "koroniarz" у Літве. Заўсёднае падпарадкаваньне зьмяніла ўсю літоўскую і польскую шляхту ў адзіны "шляхецкі народ" . Колькі ў якім родзе крыві польскай, а колькі літоўскай, таго ўжо сёньня не знайсьці. Калі б заснаваць з гэтай мэтай адмысловы інстытут дык ён меў бы сто год непатрэбнай працы і ў выніку ў палове выпадкаў пацьвердзіў бы, што пытаньне не вырашана.

З гэтых трох родаў польскай іміграцыі ў Літву першы ня меў этнічнага значэньня, трэці быў узаемнай сямейнай справай, чыста прыватнай натуры. Можна тады казаць аб палянізацыі Літвы праз іміграцыю Палякаў толькі на столькі, на колькі мог граць ролю наплыў арандатараў з Кароны. Навогул кажучы ня вельмі гэтая іміграцыя багацела ў Літве. Ані польскі жаўнер, ані арандатар прыбываючы ў Літву не выцясьняў Літвіна – але займаў незанятае мейсца, хутчэй вырабляў сваёй працай новыя мейсцы.

Іміграцыі арганізаванай грамадою, скіраванай на пэўны пункт літоўскай зямлі не было праз увесь час, пачынаючы ад канца XIV аж да канца XVIII ст., ніводнага

прыкладу. Польскі ўрад ня змог гэтага рабіць, бо не валодаў якой-небудзь уладаю ў Літве; літоўскаму ўраду гэтага рабіць ня трэба было, бо для таго, каб абрабіць літоўскія ўладаньні хапала літоўскіх і беларускіх працоўных рук (тут адна з прычынаў экспансіі беларускай масы не на карысьць літоўцаў).

Калі ж пазьней пачынаючы ад XVI ст. польскі селянін рушыў у сьвет, не іміграваў ён у Літву, але ў Паўднёвую Русь.

Літоўскі ўрад зганяў некалькі разоў масавую мазурскую іміграцыю, але заўжды толькі на самыя ўзьмежкі Вялікага Княства ад маскоўскай сьцяны, ані разу на літоўскую этнаграфічную тэрыторыю.

Ва ўнутраныя літоўскія справы польская палітыка ня ўмешвалася. Гэта

было немагчымым пры аўтаномным складзе абедзьвюх дзяржаваў, бо кожнае ваяводзтва было самакіруемым арганізмам. Умяшаньне ўраду ці то ў Кароне, ці на Літве, было на "справы земскія " недапушчальным.

Школьніцтвам тагачасная дзяржава не займалася; гэта было пакінута Касьцёлу і прыватнай ініцыятыве. Толькі пры Станіславе Аўгусьце (Панятоўскім) урад заняўся публічным выхаваньнем. І былі дзьве адукацыйныя камісіі: каронная і літоўская, і ўсяляк літоўская не была ні ў чым ад польскай залежнай.У справах зьнешніх кіравала ня Польшча, але наадварот: Літва заваладала **цалкам** зьнешняй польскай палітыкай і надавала ёй кірунак. Дзеля Літвы ўвага Польшчы адварочвалася ўсё больш ад Захаду, да моманту, калі была выключна паглынутая ўсходнімі справамі, перастала цалкам належаць да эўрапэйскай групы дзяржаваў, згубіла палітычную сувязь з Эўропай, згубіла голас у міжнароднай палітыцы. А ўсходнія справы не былі справамі Кароны, але Вялікага Княства; сталіся польскімі толькі дзеля таго, што Польшча дакладна выконвала варункі уніі. Бараніла ад Масквы межы зусім не польскія, але літоўскія.

Калі і ў якіх акалічнасьцях польская мова стала вядомаю літоўскай шляхце – невядома. Ніхто гэтай справы не дасьледаваў. Так неяк "само сабою зрабілася", што ніхто не ведае, ані калі, ані як. Але вядома, што ўсё кола князёў літоўскіх, якія зьехаліся ў 1386 годзе ў Кракаў на шлюб Ягайлы з Ядзьвігай, не патрабавала перакладчыкаў для таго, каб паразумецца з палякамі, бо размаўлялі па-беларуску. Гэтая мова лічылася доўга літоўскаю, бо нават у Польшчы ня ведалі, што існуе яшчэ іншая ўласна літоўская. Толькі беларуская мова гучала пры двары Ягайлы, каралевы Сонькі і Казімера Ягайлавіча (Ягэлёнчыка). Такім чынам літоўскія дынастыі былі ад пачатку моцна русіфікаваныя, бо **не прывезьлі з сабою ў Польшчу літоўскай мовы, але рускую**. Першым спалянізаваным Ягэлёнам быў Ян Ольбрахт, другім Жыгімонт Стары.

Палянізацыя выціскала з вышэйшых пластоў літоўскага народу не літоўскае, але рускае. Літоўская мова відавочна ня вельмі была ва ўжытку гэтых пластоў і ўсёй шляхты, калі нягледзячы на працяглыя ўзаемныя адносіны ад XIV стагодзьдзя няма ў польскай літоўскіх сьлядоў. Калі б ня хрост, ніхто б не клапаціўся пра літоўскую мову; але польскія ксяндзы маючы зацьвердзіць народ у веры, хочучы знайсьці да яго доступ вучылі гэтую мову, а потым ужо ўсё ішло нармальным шляхам, як ва ўсіх навернутых народаў.

Духоўнае пісьменства прычынілася вельмі моцна, каб на яго падставе выпрацаваць мову публічнага жыцьця. Ўжо даўно былі слоўнікі, былі ўжо паэты, а руская мова як была, так і заставалася ўрадаваю. Было так, як хацелі Літвіны, кіруючы самі ва ўласнай дзяржаве. Калі складалі сабе Статут Літоўскі, зрабілі гэта па-беларуску. Палякі ніколі не накідвалі Літве польскай мовы як урадавай. Часта пісалі акт па-польску, але ўсе ўрадавыя формулы, асабліва на пачатку і ў канцы акту пісалі па-беларуску, хоць таксама часта лацінскім альфабэтам (сам бачыў, трымаў у сваіх руках сотні такіх актаў). Пытаньня ўвядзеньня літоўскай мовы, як урадавай ніколі не разглядалі, нават не ўздымалі, хоць гэта мог зрабіць кожны соймік Вялікага Княства.

Але аднак не лічылі літоўскай шляхты Палякамі. У кожным акце уніі, ў запавеце Жыгімонта Аўгуста, ў элекцыйных актах, у канстытуцыях вальных соймаў, усюды, заўжды выразна была гаворка **аб двух народах**. Увогуле не існавала выразу *gente Lithuanus, natione Polonus!*[2] Наскрозь палянізавалася руская шляхта пасьля казацкіх войнаў; літоўская этнаграфічна заставалася Літвінамі, і зусім не забывала роднай мовы. Сустракалася з ёй кожную нядзелю ў касьцёле, і кожны дзень пры рэалізацыі свайго патрымоніюм (валоданьня) ў спадчыннай вёсцы. Гэтая шляхта ніколі не выракалася літоўскай мовы, ужывала толькі разам з ім другую яшчэ мову: найперш беларускую, потым польскую. І ўжо зусім фальшывым зьяўляецца погляд, нібыта польская мова выціскала літоўшчыну; яна выціскала рушчызну.

Калі б Літвіны не перанялі польскай культуры, яны б завязьлі ў рускай і ... не было б сёньня літоўскага народу. Ніводзін літоўскі мужык не спалянізаваўся, бо польскі народ у Літву ня ехаў, калі тым часам Літвіны саступалі заўжды беларускай экспансіі і саступаюць дагэтуль. Без уніі з Польшчай рускі напор быў бы мацнейшы і ўсебаковы, акаляючы народ і шляхту, жыцьцё сьвецкае і касьцельнае. Без уніі з Польшчай Літва сталася б "праваслаўнай".

Пасьля падзелаў супольная нядоля наблізіла абодва народы яшчэ мацней. Яшчэ мацней гарнулася Літва да больш разьвітай культуры на падмурку якой культурная праца была лягчэйшаю. Ці ж можна закінуць Палякам XIX стагодзьдзя, што накідвалі яе гвалтам? Ведаю толькі аднаго палянізатара літоўскай шляхты. Імя яго: Мураўёў. Гэты зрабіў з Літвы мучаніцу польскасьці і ўзьняў праз гэта польскасьць у вачах літоўскай шляхты да ўзроўню сьвятасьці. Спалянізаваў Літву ня польскі, але расейскі гвалт.

Да якой цывілізацыі належаць тыя Літвіны, што насаджаюць літоўскі патрыятызм на нянавісьці да Польшчы. Штосьці з туранШчыны дала ім школа, з гэтай турка-славянскай, маскоўскай культуры. У тых, якія прынесьлі з дому хоць троху каталіцкай традыцыі, адбываецца слабая барацьба туранШчыны з лацінствам; калі ж "прагрэс" аддаляе гэтых людзей ад каталіцызму, які для іх толькі мужыцкі перажытак, у такім разе барацьбы зусім няма. Дашчэнту зрусіфікаваныя розумы, лятуць па нахіленай за прыкладам Расеі, гатовыя да шмат якіх чынаў, але пазбаўленыя культуры чыну; таму іх чыны фатальна адбіваюцца на самой Літве. Змаскаленьне розумаў пазнаецца і па тым, што пагардзіўшы ўсялякім гістарызмам, асудзіўшы ўласныя літоўскія дзеі, пачынаюць ствараць сьвет *ab ovo*[3], без традыцыі. Выключаюць з літоўскай справы літоўскае мінулае, спрабуючы стварыць нацыянальныя рысы паводле пэўнага пляну, бо вераць у расейскі прыклад – у мажлівасьць штучнага стварэньня грамадзтва. Паразуменьне з этнаграфічна літоўскай масай, але культурна маскоўскай немажлівае.

Можа быць знойдуцца ў Літве вызнаўцы заходне-эўрапейскай цывілізацыі, але мы самі ня створым іхныя суполкі! Літва павінна сама здабыць іх у сабе, яны сваімі ўласнымі сіламі павінны стаць панамі сытуацыі ў сваёй Айчыне.

У гэтым адзінае выратаваньне Літвы. Нягледзячы на тое, ці Літвіны, што трымаюцца лацінскай цывілізацыі былі б прыяцелямі, ці непрыяцелямі Польшчы (і тое, і другое мажліва), ад існаваньня такой літоўскай групы і ад яе пашырэньня пазьней будзе залежыць сам быт (існаваньне) літоўскай нацыі. Пры маскоўскай культуры не ўтрымаецца ніводная нацыя, а тым больш гэтак слабая, як літоўская.

---

[1]*Літва* – выраз "Літва" мае рознае значэньне геаграфічнае, этнаграфічнае, палітычнае. Ў выснове, што падаецца вышэй я ўжываў яго ў значэньні энтаграфічна-нацыянальным паводле сёньняшняга энтаграфічнага стану (Ф.К.)

[2]*gente Lithuanus, natione Polonus!* – родам Літвін, нацыянальнасьцю – Паляк! (АСК)

[3]*ab ovo* – ад пачатку (АСК)

РЭВАЛЮЦЫЯ І АСОБА

КОНТАРРЭВАЛЮЦЫЯ Ў ЧЫЛІ

альбо чым быў насамрэч пераварот гэнэрала Піначэта

АУГУСТА ХАСЭ ПІНАЧЭТ УГАРТЭ нарадзіўся 25 лістапада 1925 году ў Вальпараіса. Ад раньняй маладосьці ягонай мэтай была вайсковая кар'ера. У 1936 годзе скончыў Вайсковую Школу Чылійскіх Узброеных Сілаў, атрымаўшы ступень падпаручыка. Хачу тут прывесьці показку пра заканчэньне першага этапу вайсковай кар'еры Піначэта. Аўгуста Піначэт прыйшоў у Сант'яга ў касьцёл дзе знаходзіўся абраз Маці Божай Нястомнай Дапамогі, і ўсталяваў у якасьці падзякі мармуровую табліцу з надпісам: "Дзякуй Табе Маці Мая, будзь мне заўжды помаччу. Падпаручык А. Піначэт – 1936"[1]. Гэты эпізод з жыцьця пазьнейшага "крывавага дыктатара", як звычайна называе Піначэта левая апазыцыя, вельмі яскрава паказвае, якімі каштоўнасьцямі ён кіраваўся ў сваім жыцьці. Пераймаючы і справуючы ўладу ў Чылі гэнэрал шматразова зьвяртаўся за дапамогай да Маці Божае і атрымліваў яе. Як прыклад можна прывесьці хоць бы такі выпадак, які здарыўся на пяцідзесяцігодзьдзе атрыманьня ступені падпаручыка, калі кулі камуністычных баявікоў, страляныя з блізкай адлегласьці не спрычынілі яму вялікай крыўды і выразалі на шыбе (аўтамабіля) абраз Маці Божай Нястомнай Дапамогі. У 1943 годзе ён пабраўся шлюбам з Люсіяй Гірыярт. У 1949-1952 гг. быў выкладчыкам у эквадорскіх вайсковых школах, пазьней, у 1956-1959 гг. прабываў у вайсковай Місіі ў Злучаных Штатах, вярнуўшыся адкуль атрымаў ступень гэнэрала дывізыі і стаў камандзірам гарнізону Сант'яга. Прызначэньне на гэтую пасаду прыняў ад Сальвадора Альендэ. Сальвадор Ізабэліна ад Найсьвяцейшага Сэрца Ісуса Альендэ нарадзіўся ў 1908 годзе таксама ў Вальпараіса. Па прафэсіі – лекар, у якасьці хобі – палітык. У 1932-1942 гг. быў міністрам здароўя, у 1933 г. належаў да заснавальнікаў Сацыялістычнае Партыі Чылі, ў 1945-1969 гг. быў сэнатарам, апошнія тры гады выконваў функцыю старшыні Сэнату. Тры разы атрымаў паражэньне на прэзыдэнцкіх выбарах і нават атрымаў мянушку "вечнага прэтэндэнта". Аднак чацьвёрты раз выйграў у агульных выбарах ў 1970 годзе, як супольны кандыдат Сацыялістычнай Партыі (хоць абедзьве партыі доўга вагаліся перш чым яго выбралі. ЦК Сацыялістычнае Партыі прагаласаў за ягоную кандыдатуру ў суадносінах галасоў 12 – за; супраць – не было; і аж 13 – устрымаўшыеся ад галасаваньня) яму было аддадзена 36,1 % галасоў і згодна з выбарчым заканадаўствам ягоную кандыдатуру павінен быў разглядаць Кангрэс. Альендэ перамог і тут.

Стаўшы прэзыдэнтам Альендэ зьменшыў колькасьць ужываемых імёнаў, пакідаючы, як сам прызнаўся з прычынаў прапаганды, толькі адно Сальвадор (ад слова Salvadore – Збавіцель), пасьля чаго неадкладна распачаў шэраг рэформаў, якія хутка давялі краіну да катастрофы. Дзеяньні прэзыдэнта паводле, польскага дзеяча (хіба што з Уніі Працы) Пятра Цішэўскага, кіраваліся да запэўненьня народу лепшых матэрыяльных умоваў. На шляху дасягненьня гэтай мэты былі замежныя канцэрны, што валодалі большасьцю вытворчасьці. Яны не былі зацікаўленыя дабрабытам працоўных, адно толькі павялічэньнем даходаў. Іх даходы не павялічвалі даходу дзяржавы, але ішлі за мяжу. Прэзыдэнт вырашыў нацыяналізаваць асноўныя галіны вытворчасьці. Відавочна гэта не спадабалася "вялікім уладальнікам"[2] і нацыяналізацыя прынесла эфэкт далекі ад жаданага – яшчэ дзесяць гадоў таму багатай дзяржаве пачаў пагражаць прывід голаду, а інфляцыя, якая ў 1970 г. была 20 %, узрасла ў 1972 г. да 163 % і ... да 750% у сярэдзіне 1973 г. Аднак ужо раней сацыялістычная гаспадарка дасягнула традыцыйных для яе мэтаў: дзяржава ўзяла ў свае рукі медзяныя, салетраныя шахты і жалезныя руднікі, перадала "людзям працы" (хоць не ва ўласнасьць) 9 млн. га зямлі. На працягу першых двух год прэзыдэнтуры Альендэ і падтрыманы ім "Рэвалюцыйны Рух Левых" – па-гішпанску "MIP" нацыяналізаваў 1767 маёнткаў (дадзеныя паводле: Roman Konik „Czarna Legenda Generaia", Dom wydawniczy „Ostoja", Krzeszowice 2004). У "клясавых ворагаў" адабралі таксама ўсе банкі і 200 вялікіх прадпрыемстваў. Вось такі быў балянс двух гадоў ўрадаваньня Сальвадора Альендэ у палацы Ля Манэда[3]. Нават сямья прэзыдэнта прызнавала, што "хапіла ледзьве трох гадоў урадаў дзядзькі (гэтыя словы пісала пляменьніца Сальвадора Альендэ – зацімка ПТВ), каб ня стала ў крамах харчоў і асноўных сродкаў гігіены"[4].

Не без прычыны Альендэ быў ацэнены дзеячамі ў левым сьвеце. Падзяляў тэорыю Мао Дзе-Дуна, ставіў у прыклад Брэжнева, а Фіделя Кастра трактаваў як указальніка для сваіх пачынаньняў, а таксама быў аб'ектам пашаны ў іншых "вялікіх" левых палітыкаў сярод якіх быў і "Камандантэ" Эрнэста Гэвара, які цаніў тагачаснага сэнатара за ягоную "непахісную веру ў сацыялізм".

Першыя страйкі пачаліся напрыканцы 1971 году, калі ў Сант'яга дайшло да вялізнай маніфэстацыі жанчынаў, якія пратэставалі супраць нястачы тавараў у крамах пры адначасовым экспарце харчу на Кубу. Жанчыны ідучы ў кірунку Ля Манэды стукалі пустымі каструлямі, адкуль назва – "Марш пустых каструль". "Буржуазныя" гаспадыні былі атакаваныя сацыялістычнымі (імя Эльма Каталана) і камуністычнымі (імя Раманы Парра) вайсковымі арганізацыямі, а таксама "мірыстамі".

Гэта аднак не паўстрымала хвалі незадаволеньня – адбываліся чарговыя пратэсты, пік якіх наступіў у 1973 г. Не дапамагла замена трываючага ў Сант'яга надзвычайнага становішча на ваеннае. Факт, што над краінай панаваў голад, а на крамных паліцах не было нават воцату, выгнаў людзей на вуліцы. Пачалі кіроўцы грузавікоў, пазьней да іх далучыліся чыгуначнікі, маракі, гандляры. Як жа клапаціўся Сальвадор Альендэ аб патрэбах "людзей працы"? Інспіраваны ім MIP ажыцьцявіў сэрыю тэрарыстычных актаў, як напрыклад падрыў слупоў высокае напругі. Мэтаю гэтых дзеяньняў было запужваньне людзей і спроба скіданьня адказнасьці за кепскае становішча на "правых рэакцыянэраў" і "ворагаў прагрэсу", якіх абвінавачвалі ў забойствах "мірыстаў". Далей прэзыдэнт наладзіў кантрабанду зброі з Кубы і Чэхаславаччыны ў Чылі. Было бязмытна перавезена больш ручной зброі, чым яе мела, лічучае 26 000 жаўнераў, чылійскае войска. Прэзыдэнт меў намер "раздачы" гэтага арсэналу лояльным яму працоўным, калі "кулакі і сацыялістычная сьвядомасьць гэта за мала, каб змагацца з сіламі рэакцыі".

Альендэ таксама стварыў "Групу Асабістых Сяброў" (ГАС). Гэта быў аддзел "верных з найвярнейшых", спраўджаных "мірыстаў", заданьнем якіх было забіцьцё вайсковых афіцэраў вышэйшых ступеняў, у выпадку, калі б дайшло да перавароту. Яшчэ 50 "Асабістых Сяброў" складала ахову прэзыдэнта.

Між іншым з камандзірам сухапутных войскаў, гэнэралам Карлам Пратсам, здарылася цікавая прыгода, якая потым давяла да зьяўленьня на сцэне гэнэрала Піначэта. Вось жа ня вельмі папулярны з прычыны сваіх яўных праўрадавых сымпатыяў (якія сярод вайскоўцаў не былі занадта распаўсюджаныя – адсюль вынікае ўтварэньне супраціву афіцэрам ГАСу, які паводле Альендэ павінен быў ачысьціць войска ад непрыхільных яму людзей), гэнэрал быў ганебна зьняважаны адной старэйшай жыхаркай Сант'яга, Аляксандрай Кокс дэ Вальдывеска, якая

едучы на машыне і ўбачыўшы ў суседнім аўтамабілі Пратса...паказала яму язык. Ганарлівы афіцэр ня мог зьнесьці такой зьнявагі з боку старой, а таму ў злосьці схапіўся за пісталет. Аднак з-за таго, што меў слабыя вочы гэнэрал прамахнуўся. Сівавалосая ж пані націснуўшы на пэдаль газу да межаў мажлівасьці пачала ўцякаць ад галоўнакамандуючага ўзброеных сіл. Пратс рушыў за ёй. Аднак пагоня ня доўжылася збыт доўга, бо разгневаны гэнэрал вельмі хутка здагнаў знэрваваную пані Кокс дэ Вальдывеска, прыклаў пісталет да яе скроні і выкрыкнуў са злосьцю: "Прасі прабачэньня, халера, бо цябе заб'ю". Старая ж прабачацца не намервалася і мажліва Пратс выканаў бы сваю пагрозу, калі б ня факт, што навокал зьявіўся варожы гэнэралу натоўп, які выпусьціў паветра з шынаў яго аўтамабіля і прымусіў яго ратавацца ўцёкамі таксоўкай.[5] Гэта быў канец гэнэрала Пратса. У хуткім часе яго мейсца заняў гэнэрал Аўгуста Піначэт.

Войска карысталася ў Чылі вялікім даверам як ва ўрадзе, гэтак і ў апазыцыйным Кангрэсе. Людзі ў форме лічыліся безбаковымі і паважанымі. Яны ўяўлялі сабою занадта вялікую сілу, каб Альендэ здолеў іх сабе падпарадкаваць за такі кароткі час, бо афіцэрскі корпус складаўся з гарачых каталікоў, такіх як Піначэт, якім не даспадобы было кіраваньне атэіста, масона і камуніста.

Тым часам крызыс трываў далей. Сацыялістычныя і камуністычныя баявікі адкрылі агонь у гарнякоў у шахце Эль Тэньентэ, страйкі не пераставалі, апошнія незалежныя СМІ казалі аб сытуацыі ў краіне гэтак: "Ў Сант'яга не хапае мяса..."; "Мільён працоўных страйкуе...";

.

Урад ад самага пачатку існаваньня стараўся ўзяць усю ўладу, выразна імкнучыся да шчыльнага гаспадарчага і палітычнага кантролю грамадзянаў з боку Дзяржавы і гэтым самым усталяваць таталітарную сыстэму, якая цалкам супярэчыць рэпрэзэнтацыйнай дэмакратычнай сыстэме ўсталяванай у Канстытуцыі.

"Жахлівы недахоп хлеба...", ў той час, калі прэса рэжыму (Клярын) казала аб тым, што... "80 000 працоўных далучыліся да барацьбы з чорным рынкам"[6]. Кангрэс штораз вастрэй выступаў супраць прэзыдэнта, войска першы раз пакінула казармы і 29 жніўня робячы маніфэстацыю сілы рушыла ў бок Ля Манэды. Нягледзячы на гэта ўлады цалкам не згубілі даверу да войска і хаця некаторыя міністры спадзяваліся перавароту, Альендэ не надаваў вагі гэтай пагрозе.

Да пералому ў адносінах Кангрэс – Прэзыдэнт дайшло ў чэрвені 1973 г., а ў жніўні Кангрэс ухваліў дакумэнт называны "Дэклярацыяй падзеньня дэмакратыі ў Чылі", які пералічваючы гвалт адносна Канстытуцыі Сальвадорам Альендэ, прадставіў "гэтае важкае злачынства адносна канстытуцыйнага і юрыдычнага парадку Рэспублікі" найважнейшым дзяржаўным органам, у тым ліку і войску. Другой мэтай ухвалы было "засьведчаньне перад імі (органамі), што з увагі на іх функцыі, прысягу захаваньня вернасьці Канстытуцыі і іншых правоў (...), ім трэба пакласьці неадкладны канец усім узгаданым акалічнасьцям, якія парушаюць Канстытуцыю і іншыя правы". З гэтага тэксту варта зацытаваць вялікі фрагмэнт – пп. 5 і 10:

5. Фактам зьяўляецца тое, што актуальны ўрад ад самага пачатку існаваньня стараўся ўзяць усю ўладу, выразна імкнучыся да шчыльнага гаспадарчага і палітычнага кантролю грамадзянаў з боку Дзяржавы і гэтым самым усталяваць таталітарную сыстэму, якая цалкам супярэчыць рэпрэзэнтацыйнай дэмакратычнай сыстэме ўсталяванай у Канстытуцыі.;

10. Сярод пэрманэнтных парушэньняў Ураду асноўных гарантый і правоў, замацаваных Канстытуцыяй можна вылучыць наступныя:

c) Парушыў аснову аўтаномії Ўнівэрсытэтаў і правы якія ім прызнае Канстытуцыя, да заснаваньня і ўтрыманьня тэлевізійных станцыяў, падтрымліваючы ўзурпацыю 9-га каналу Чылійскага Ўнівэрсытэту, атакуючы гвалтам і затрыманьнямі 6-ты канал гэтага ж Унівэрсытэту, а таксама ўскладняючы распаўсюджваньне ў іншых правінцыях краіны каналу Каталіцкага Ўнівэрсытэту Чылі.

d) Ўскладняў, рабіў немажлівым, а часамі спыняў пры ўжыцьці сілы выражэньне грамадзянамі, каторыя не былі на баку рэжыму, права да свабоды сходаў, падчас, калі стала дазваляў арганізоўваць групы баявікоў, якія не падпарадкоўваліся адпаведным прадпісаньням, а таксама кантралявалі вуліцы і дарогі з мэтаю запужваньня людзей;

e) Абмяжоўваў свабоду навучаньня, безпадстаўна ўводзячы з дапамогаю нелегальнага дэкрэту г.зв. "Дэкрэту аб дэмакратызацыі навукі" асьветніцкую праграму маючы на мэце марксісцкую індактрынацыю;

f) Сытэматычна парушаў канстытуцыйныя гарантыі ўласнасьці альбо дазваляючы больш чым 1500 нелегальных "канфіскацыяў" маёнткаў і сотняў прамысловых і гандлёвых адзінак, каб потым іх нацыяналізаваць альбо бяспраўна кантраляваць і такім чынам, праз рабаўніцтва ўсталяваць дзяржаўны кантроль над гаспадаркаю, што сталася адным з рашучых прычынаў упадку вытворчасці, спыненьня паставак, чорнага рынку.[7]

(працяг будзе)

Петр Т. Вашкевіч

---

[1] цытата і гісторыя паводле: A.Solak, „Maryja i Augusto Pinochet", www.wandea.org

[2] P.Ciszewski, „Zamach stanu w Chile w 1973 roku", цытата паводле www.gavagai.pl/society/chile.php

[3] даныя паводле: W.Klewiec, „Proces pokazowy Oskarżany Augusto Pinochet", El-ka, Warszawa, 2001 cc.28-29

[4] цытата паводле: R.Konik, „Czarna legenda generala", DW „Ostoja", Krzeszowice, 2004

[5] W.Klewiec, „Proces pokazowy Oskarżany Augusto Pinochet", El-ka, Warszawa, 2001 cc.21-22

[6] W.Klewiec, „Proces pokazowy Oskarżany Augusto Pinochet", El-ka, Warszawa, 2001 c.35

[7] Ухвала Чылійскага Кангрэсу ад 23.08.1973, цытата паводле: www.datapolis.pl/grzes

Радыё Марыя можна слухаць на кароткіх хвалях ад панядзелку да суботы ад 8.00 да 10.15, а таксама ў нядзелю ад 9.00 да 11.00 у дыяпазоне 19 м на частаце 15455 kHz; штодзённа ад 20.00 да 01.00 у дыяпазоне 41 м на частаце 7400 kHz (час Рэспублікі Беларусь)

У інтэрнэце:
www.radiomaryja.pl

КАТАЛіЦКі ГОЛАС У ТВАіМ ДОМЕ

НОРАВЫ

пачатак на стар. 7

паслабленьне ролі сям'і, і як наступства – зьніжэньне нараджальнасьці.

Як бачна з вышэйпрыведзенага востры канфлікт паміж фэміністычнымі ідэямі і традыцыйным ладам прыводзіць да падважаньня фундамэнтальных асноваў існаваньня чалавецтва.

Беларуская спэцыфіка

Беларуская спэцыфіка ґэндэрнага пытаньня фармавалася ва ўмовах прысутнасьці некалькіх цывілізацыйных (рэлігійных) мадэляў. Гэтак на першым – пляменным этапе, калі паганства было пануючым, выявіўся родавы тып існаваньня этнічнай супольнасьці. Для родавага тыпу характэрныя досыць свабодныя стасункі паміж асобамі рознае плоці, тым ня меней хутчэй за ўсё не назіралася шматжэнства як пануючай сыстэмы, а аб'ектыўныя ўмовы існаваньня роду вызначалі традыцыйны падзел функцыяў паміж мужчынай і жанчынай.

З прыходам хрысьціянства родава-пляменная спэцыфіка ня зьнікла адразу, але працягвала суіснаваць з хрысьціянскай, якая аднак паступова але пасьлядоўна выцясьняла першую. Хрысьціянская супольнасьць характарызавалася цьвёрдымі адносінамі, што да сужыцьця абедзьвюх плоці мужчынскай і жаночай, а таксама захоўвала і ўмацоўвала традыцыйны падзел роляў, надаючы гэтаму падзелу апроч чыста функцыянальнай неабходнасьці яшчэ і духоўны сэнс паводле словаў апостала Паўла, прыведзеных у першым раздзеле. Разьвіцьцё і глыбейшае пранікненьне хрысьціянства розных канфэсій наклала свае асаблівасьці, якія аднак не перакрэсьліваюць агульнага для ўсіх патрыярхальнага ўкладу. Асаблівасьці палягалі на прыналежнасьці да таго ці іншага тыпу духовасьці: візантыйскага ці заходне-каталіцкага. Спэцыфічнай рысай таксама было і тое, што да заходне-каталіцкай духоўнасьці належала пераважна шляхта, якая валодала значна вышэйшым за простых сялян узроўнем адукацыі. У выніку роля жанчыны ў шляхэцкай сям'і была больш разнастайнай і палягала дадаткова на ажыцьцяўленьні сацыяльных функцый: ўчынкаў міласэрнасьці і дапамогі бліжнім. Жанчыны-шляхцянкі валодалі безумоўна значным узроўнем грамадзкай сьвядомасьці, якую аднак рэалізоўвалі не ў мурах парлямэнтаў і камісій, але ў працэсе выхаваньня і маральнай падтрымкі. Адпаведна стасунак да кабеты з боку шляхцічаў у ідэале быў падкрэслена рыцарскі, што нават адлюстроўвалася ў назвах і акрэсьленьнях, гэтак асобаў жаночай плоці называлі "асобамі стану белагаловага", "белы" у дадзеным выпадку абазначае чысты. Чыстасьць гэта мела таксама на ўвазе і няўдзел у жорсткай, а часам "бруднай" мужчынскай палітычнай барацьбе, пані стаялі ў дадзеным выпадку па-над гэтым. Падобныя стасункі цэмэнтаваліся і падтрымліваліся вучэньнем Каталіцкай Царквы.

Падобная сытуацыя існавала збольшага да сярэдзіны-канца XVII ст. пасьля чаго пад уплывам асьветніцтва пачынаецца паступовае

ТРАДЫЦЫЙНЫ ПОГЛЯД
на ґэндэрныя стасункі

аслабленьне і нават дэградацыя старога парадку. На гэта наклаліся адначасова неспрыяльныя зьнешнепалітычныя ўмовы, якія прывялі да фактычнага неспаўненьня некаторых важных функцый значнай колькасьцю мужчынаў – асобаў шляхэцкага стану. Найвыразьнейшымі праявамі гэткага стану сталі нежаданьне абараняць свой край, а таксама глыбока закараняючаяся прыхільнасьць да моцных алькагольных напояў. За гэтым ішло агульнае разбэшчваньне нораваў, перанесенае з Заходняй Эўропы. Найлепш характарызуе гэты стан выказваньне Прускага Караля Фрыдэрыка Вялікага, які ў 1752 г. гэтак сказаў аб парадках пануючых у Рэчы Паспалітай: *у гэтай краіне розум патрапіў у залежнасьць ад жанчын, яны інтрыгуюць і вырашаюць усё, у той час, калі мужы напіваюцца.*

Пасьля падзелаў Рэчы Паспалітай, паўстаньняў, рэвалюцыяў XIX-XX стст. можна сказаць, што старадаўні шляхэцкі ідэал амаль не захаваў сьлядоў у сёньняшнім беларускім грамадзтве, але як раз ён найбольш гэтаму грамадзтву патрэбны.

Пераважная большасьць сялянства захавала свой патрыярхальны ўклад ажно да бальшавіцкай рэвалюцыі 1917 г., калі пачаліся працэсы "ліквідацыі" непісьменнасьці, а разам з гэтым і "вызваленьня" жанчыны. Гэтак у прапагандысцкім матэрыяле "Некаторыя даныя аб культуры і быце калгасаў БССР" (1931 г.) падкрэсьліваецца, што "калектывізацыя зьяўляецца базай для распрыгоненьня жанчыны...каб можна было ўцягнуць яе ў сацыялістычнае будаўніцтва, паставіць яе і ў вытворчасьці і ў грамадзка-палітычнай рабоце нараўне з мужчынам". Іншы дасьледчык С.Я.Вольфсан у сваёй кнізе "Сям'я і шлюб у іх гістарычным разьвіцьці" (1937 г.) паказаў прынцыповае адрозьненьне сям'і сацыялістычнага грамадзтва ад сям'і пэрыяду капіталізму. Ён падкрэсьліў тую акалічнасьць, што складаньне новых сямейных адносін ідзе ў барацьбе са старым сямейна-побытавым укладам і зьвярнуў асаблівую ўвагу на мерапрыемствы дзяржавы, скіраваныя на "разьняволеньне" жанчыны.

Такім чынам можна пэўна сказаць, што асьветніцкія і фэміністычныя ідэі ў савецкай рэчаіснасьці прышчапляліся сілавым шляхам, зьнішчаючы стары ўклад і нацыянальныя традыцыі. Гэты працэс працягваўся да канца 60-х гадоў XX ст. пасьля чаго культурныя працэсы ў СССР сталі больш дапасаванымі да агульна-эўрапэйскіх, якія спрычыніліся да канчатковай ліквідацыі традыцыйнага ўкладу ў гарадах і ў значнай ступені на вёсцы.

Высновы

Падсумоўваючы вышэйапісанае можна зрабіць наступныя высновы:

1."Вызваленьне" жанчыны сталася вынікам распаўсюду ідэалёгіі "асьветніцтва", якая супрацьпастаўляла традыцыйным іерархічным нормам, што былі закладзены з Божай волі, свае альтэрнатыўныя нормы, і таму ня мае пад сабой аніякіх сацыяльна-эканамічных падставаў.

2.Фэміністычныя ідэі зьяўляюцца выключна шкодным і дэструктыўным фэрмэнтам для нацыянальнай культуры і традыцыяў, а да таго ж яны ёсьць палітычным капіталам левых, сацыялістычных і бальшавіцкіх арганізацый, якія ўжо выявілі сваю разбуральную сутнасьць.

3."Вызваленьне" жанчыны нясе за сабой дэградацыю сям'і і зьніжэньне нараджальнасьці, што ў актуальнай дэмаграфічнай сытуацыі ў Беларусі і ў Эўропе прыводзіць да катастрафічных наступстваў (зьнікненьне беларусаў, як этнасу і эўрапэйцаў увогуле)

Несучасны чалавек

---

[1] *натуральныя перадумовы* – дзецяродная функцыя, якую маюць выключна жанчыны

[2] напрыклад, згодна з фэміністычнай канцэпцыяй жанчына павінна мець безумоўнае права працаваць на ўкладцы асфальту або служыць у войску, носячы зброю і г.д.

[3] у сваёй найбольш радыкальнай вэрсіі гэта выражаецца ў сумніве ў неабходнасьці сям'і, як сацыяльнага інстытута

Газэта «Літва» была адноўлена ў 1995 р. Да 1998 р. у рэдакцыю ўваходзілі Уладзімер Міхневіч, Аляксандар Ян Стральцоў-Карвацкі і Уладзімер Пятровіч. З 1999 р. склад рэдакцыі зьмяніўся і гэты нумар падрыхтавалі:

Рэдактар:
Аляксандар Ян Стральцоў-Карвацкі

Вёрстка:
Марцін Койдан

Нашы прынцыпы і як нас знайсьці:

Рэдакцыя газэты друкуе матэрыялы з мэтай забезпячэньня свабоднага пераплыву інфармацыі, бяз згоды аўтараў і не нясе адказнасьці ў адпаведнасьці з заканадаўствам аб аўтарскіх правах, у сувязі з адсутнасьцю прававое дзяржавы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Адказныя за дакладнасьць фактаў, пададзеных у артыкулах суць аўтары публікацый. Рэдакцыя мае права на стылёвае і граматычнае рэдагаваньне аўтарскіх матэрыялаў.

Поштавая скрынка:
п/с 26, 220050 Менск-Літоўскі
Рэч Паспалітая Літва - Res Publica Lithvania
e-mail: ligawkl@tut.by